Цана асобнага нумару 10 кап.

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

НЯДЗЕЛЯ
5 САКАВІКА 1933 г.
№ 51 (37 1)

Паведамленьне АДПУ

ТАСС, 4. За апошніх часы органамі АДПУ раскрыта і ліквідавана контррэвалюцыйная шкодніцкая арганізацыя ў некаторых органах Наркамзему і Наркамсаўгасаў, галоўным чынам у сельска-гаспадарчых раёнах Украіны, Паўночнага Каўказу і Беларусі.

У склад контррэвалюцыйнай шкодніцкай арганізацыі ўваходзілі, галоўным чынам, дзяржаўныя служачыя, у большасці сваёй—выхадцы з буржуазных і памешчыцкіх пластоў.

Большасць арыштаваных прызнала сваю віну ў арганізацыі контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай дзейнасьці ў сельскай гаспадарцы, якая выявілася: 1) ў наўмысным псаваньні і зьнішчэньні трактароў і с.-г. машын, 2) у наўмысным засьмечваньні палёў і зьнішчэньні ўраджайнасьці, 3) у падпале машына-трактарных станцый і ільназаводаў, 4) у раскрадваньні збожжавых запасаў калгасаў, 5) у дэзарганізацыі сяўбы і ўборкі, 6) зьнішчэньні пагалоўя рабочай і прадукцыйнай жывёлы.

Матар'яламі сьледзтва і показаньнямі арыштаваных шкоднікаў устаноўлена, што дзеяньні арыштаваных мелі сваёй мэтай падарваць сельскую гаспадарку і выклікаць голад у краіне.

Арыштавана больш за 70 чалавек, у тым ліку: Канар, ён-жа Палашчук Фёдар Міхайлавіч, Крамянецкі Мікола Мікалаевіч, Скарупскі Эдуард Сігізмундавіч, Кузьняцоў Іван Васільевіч, Вольф Майсей Міхайлавіч, Крамрэнка Іван Трафімавіч, Руднеў Ціхан Міхайлавіч, Каварскі Міхаіл Ефімавіч, Карой Іван Аляксандравіч, Міхайлоўскі Георгій Мікалаевіч, Цялелін Мікалай Фаміч, Пакроўскі Сяргей Сьцяпанавіч, Фанаменка Стах Каліновіч, Гончарэнка Андрэй Якаўлевіч, Боршчык Варфаламей Данілавіч, Панамарэнка Аляксандр Сьцяпанавіч, Радзевіч Іван Вікенцьевіч, Бабак Іван Асонавіч, Шабанаў Іван Андрэевіч, Манькоўскі Аляксей Васільлявіч, Фёдараў Мікалай Паніч, Пасечнік Іван Рыгоравіч, Тарасаў Міхаіл Андрэевіч, Сапега Сямён Фаміч, Будай Паўла Пятровіч, Уліцін Цімафей Макаравіч, Багачоў Александр Мікалаевіч, Зелянкоў Александр Іванавіч, Іваноў Аляксей Мікалаевіч, Гедзіёнаў Сяргей Александравіч, Зінчанка Іван Мікалаевіч, Бойка Іван Іванавіч, Пешчанка Давыд Якаўлевіч, Шаўчанка Емельян Іванавіч, Кіяшка Фёдар Васільлявіч, Усеенка Максім Васільлявіч, Беляеў Ціхан Канстанцінавіч, Сьцебуліс Іосіф Вікенцьевіч, Сокалаў Уладзімер Давыдавіч, Еўко Аляксей Захаравіч і інш.

Сьледзтва заканчваецца.

Разгорнем спаборніцтва саветаў

НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

ДЭЛЕГАТЫ УСЕСАЮЗНАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ—У ПЕРШЫЯ РАДЫ СПАБОРНІЧАЮЧЫХ!

Пяцідзёньнік праверкі гатоўнасьці да сяўбы

Праўдзівы і поўны непахісны воль да перамогі зварот першага Усесаюзнага зьезду калгаснікаў - ударнікаў усё больш і больш пранікае ў калгасную гушчу. Узьнімаюцца новыя пласты. Ударнікі заражаюць сваім прыкладам іншых. Растуць рады перадавікоў калгаснай вытворчасьці.

Але-ж было-б грубейшай памылкай лічыць, што зварот зьезду сам па сабе забясьпечвае посьпех падрыхтоўкі да сяўбы. Не. Гэта толькі мацнейшая зброя ў руках тых, якія будуць сумленна і непакладаючы рук арганізоўваць сяўбу. Гэта зброя, як аб гэтым красамоўна сьведчаць першыя вынікі зьезду, ужо аказвае сваё магутнае ўзьдзеяньне на калгасныя масы. Лёзунг зьезду — «кожны сумленны калгаснік, кожны ўдарнік павінен адказваць ня толькі за сябе адна го, а па крайняй меры за дзесятак сваіх бліжэйшых суседзяй, таварышоў па рэбоце»—становіцца адным з самых папулярных лёзунгаў калгаснай вёскі.

Задача партарганізацый гэты заклік ударнікаў непарыўна зьвязаць са зборам насеньня, падрыхтоўкай да сяўбы і на ўсіх участках перадвясеньняй работы выкоўваць ударнікаў, расьціць шарэнгу тых, якія хочуць сумленна працаваць і берагчы калгаснае дабро. Асабліва значэньне мае, акрамя, зразумела, поўнага забясьпячэньня сяўбы насеньнем, адданая і добрасумленная падрыхтоўка каня і трактара да сяўбы. Ёсьць яшчэ такія «кіраўнікі», якія прадаўжаюць дэкляраваць і званіць ва ўсе званы аб значэньні і карысьці высокага ўраджаю і... нічога ня робяць, каб па-сапраўднаму, па-бальшавіцку забясьпечыць гатоўнасьць каня і трактара да сяўбы. Не разумеюць, мусіць, што добрая якасьць работ пры дрэнным становішчы цягла—рэч цемагчымая!

Праўда, пасьля пастановы СНК і ЦК аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да веснавой сяўбы і аб рамонце трактароў на месцах стварыўся некаторы пералом, але становішча яшчэ далёка нельга назваць здавальняючым. Стан коняй па ўхарчаванасьці і працаздольнасьці ў шмат якіх раёнах на вельмі ніскім узроўні. Абязьлічка коняй і трактароў не ліквідавана. Фуражныя фонды стварацца надзвычай марудна.

Рамонт трактароў прадаўжае ісьці чарапашымі крокамі. На 25 лютага плян рамонту выкананы на палавіну. Калі і далей справа пойдзе так, дык рамонт трактароў будзе закончан толькі к палавіне красавіка. Якасьць рамонту ў значнай колькасьці выпадкаў нездавальняючая.

Рвацтва многіх МТМ, МТС і саўгасаў не ліквідавана. Прадаўжаюць даваць дутыя заяўкі на зап. часткі. Для ліквідацыі гэтых агідналасьцей па казальна работа, праробленая ДНЕП РАПЯТРОЎСКІМ АБКОМАМ. ВАРТА БЫЛО ПА-ДЗЕЛАВОМУ ЗАНЯЦЦА ПЫТАНЬНЯМІ РАМОНТУ ТРАКТАРОЎ, РАЗАСЛАЦЬ НА МЕСЦЫ ПРАВЕРАНЫХ ЛЮДЗЕЙ, УЗЯЦЬ НА ЎЛІК ЗАПАСНЫЯ ЧАСТКІ, ЯКІЯ ЁСЬЦЬ У НАЯЎНАСЬЦІ, варта было усё гэта прарабіць, і аказалася, што ШМАТ ЯКІЯ ВОСТРА-ДЭФІЦЫТНЫЯ ДЭТАЛІ, па поваду якіх гарадкіраўнікі стварылі панику, АКАЗАЛІСЯ Ў ЦЭЛЫМ ПА ВОБЛАСЬЦІ У ЗЬЛІШКУ.

Масы слаба яшчэ ўцягваюцца ў вырашэньне важнейшай задачы падрыхтоўкі цягла да сяўбы. Ударніцтва і сацспаборніцтва на гэтым участку толькі ў зародку. Нізавы друк ня ўзяўся яшчэ як сьлед за каня і трактар. Не скарыстаны для гэтай мэты такі магутны і запаляючы дакумант, як зварот зьезду калгаснікаў-ударнікаў.

«Праўда» заклікае ўвесь мясцовы друк і рабселькораў правесьці пяцідзёньнік праверкі гатоўнасьці да сяўбы механічнай і жывой цяглавай сілы. Уся рабселькораўская армія 10—15 сакавіка руцыцца згуртаванымі радамі на бальшавіцкую праверку гэтага важнейшага участку падрыхтоўкі да сяўбы.

— У каго ў руках калгасны конь, у таго ў руках і ўраджай вашых палёў, і вашы даходы.

Так гаворыць у сваім звароце першы Усесаюзны зьезд калгаснікаў-ударнікаў. Гэта праўдзівае слова павінна стаць здабыткам кожнага калгасніка.

Пяцідзёньнік друку павінен дапамагчы падбору лепшых калгаснікаў, у асаблівасьці тых, якія прайшлі школу Чырвонай армі, у конюхі, выкрыць усіх вольных і нявольных шкоднікаў жывога цягла, прыгвазьдзіць іх да ганебнага слупу.

Аднак, справа гэтым не абмяжоўваецца. Вядома, што абязьлічка—біч калгаснай вытворчасьці—губіць каня. А дзе ліквідавана абязьлічка? Там, дзе створана сталая вытворчая брыгада з сталым складам коняй, там, дзе кожны калгаснік у брыгадзе ведае, за што ён адказвае.

У пастанове СНК і ЦК «аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да веснавой сяўбы» цэлая праграма работы ў гэтай галіне.

Што можа быць удзячней для нізавога друку, як праверка таго, ці выкананы гэтыя ўказаньні? Ці разьбіты коні на групы па іх працаздольнасьці, ці забясьпечан за імі адпаведны догляд, ці прыняты меры да стварэньня фуражных фондаў, ці правільна арганізаваны нагляд і аднаўленьне конскага пагалоўя, ці прыцягнуты да адказнасьці асобы, якія вінаваты ў няправільным, драпежніцкім скарыстаньні каня і т. д.

Ні малейшай мяккасьці і цярпімасьці да тых, якія злачынна адносяцца да каня! Павінны быць заклеймены ганьбаваньнем і тыя нізавыя партыйныя арганізацыі, земельныя органы, МТС, якія лібэральнічаюць з ворагамі народу, з злачыннымі раскрадальнікамі калгаснага дабра!

АДНАК, ПОСЬПЕХ БАРАЦЬБЫ ВЫРАШАЕ НЯ ТОЛЬКІ КОНЬ, АЛЕ І ТРАКТАР. Пяцідзёньнік друку ў гэтай галіне павінен шмат зрабіць. Перш за ўсё АБ ЗАПАСНЫХ ЧАСТКАХ. Антыдзяржаўныя тэндэнцыі ў радзе заводаў, выкрытыя ў свой час «Правдой», яшчэ ня поўнасьцю зжыты.

Зап. часткі трэба сёньня патрабаваць ня толькі з заводаў, якія іх вырабляюць, але і з усіх МТС і саўгасаў, якія захавалі свае запасы, ашукалі савецкую дзяржаву, падалі дутыя заяўкі. Гэтыя буржуазныя перараджэнцы прытрымліваюцца лёзунгу: «Сабе ўрваць што найбольш, а там—хоць трава не расьці». Пяцідзёньнік дапаможа выявіць ўсе захаваныя рэсурсы ў саўгасах і МТС і ў найкарацейшы тэрмін пераразьмеркаваць найбольш рацыянальна наяўную масу запасных частак.

Мясцовы друк ня мала піша аб дрэннай якасьці рамонту трактароў, але змоўчвае часта аб канкрэтных віноўніках і аб тым, што трэба рабіць для палепшаньня рамонту. Дрэнны рамонт—гэта ашуканьне пралетарскай дзяржавы, простая дапамога кулаку, які імкнецца ў штоб-та ні стала ўгро біць трактарны парк.

Ці мала агідніка ў і жулікаў, якія прабраліся ў рады трактарыстаў і рабочых машына-трактарных майстэрань для шкодніцтва? Ці мала партыйных шляп з партбілетам ў кішэні ў шмат якіх нашых МТС і саўгасах, дзе людзі сьлепы да гэтых злачынных дзеяньняў ворага, дзе людзі да гэтага часу яшчэ не зразумелі, што рамонт трактароў—участак жорсткай клясавай барацьбы?

Выключная адказнасьць за падрыхтоўку каня і трактара да сяўбы кладзецца на зямельныя органы, якія ў многіх выпадках засьмечаны чужымі людзьмі і нагадваюць сабой дрэнныя канцылярыі, а не кіруючы штаб. Задача мясцовага друку праверыць становішча раёных і абласных зямельных органаў, высьветліць, ці забясьпечваюць яны канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва. Бюракраты і чыноўнікі з зем. органаў, чужакі, і шкоднікі, якія прабраліся туды, павінны быць бязьлітасна выкрыты. Ні малейшага лібэральнічаньня з імі!

Вялікую дапамогу правядзеньню пяцідзёньніка друку павінны і могуць аказаць фабрыкі і заводы, якія шэфствуюць над калгасамі. Павярнуць за водзкі друк да правядзеньня пяцідзёньніка ў падшэфным раёне, арганізаваць рэйд ударнікаў у падшэфным раёне, дапамагчы ім найлепшым чынам праверыць падрыхтоўку каня і трактара да вясны—вось вялікая і гаяровая задача заводаў і фабрык.

Лепшыя мэтады масавай работы на фабрыках і заводах, ударніцтва і сацспаборніцтва павінны шырока прывацца ў калгасной вёсцы. Пяцідзёньнік павінен даць мацнейшы штуршок да росту ўдарніцтва на сяле у калгасах, саўгасах і МТС.

Зварот зьезду калгаснікаў-ударнікаў — вось праграма ўдарніцтва і сацспаборніцтва! Множыць рады ўдарнікаў на сяле, распаліць сацспаборніцтвам кожную калгасную брыгаду і ўсіх рабочых МТС і саўгасаў!

Зразумела, што ў пяцідзёньнік мясцовыя арганізацыі павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу на самым АДСТАЮЧЫМ ЗЬВЯНЕ, а не падыходзіць да пытаньня шаблённа. Там, дзе з зборам насеньня да гэтага часу справа стаіць дрэнна, гэтае пытаньне павінна заняць ВАЖНЕЙШАЕ МЕСЦА.

Больш ініцыятывы, больш удумлівых адносін да задач сяўбы!

(Перадавы артыкул «Правды»).

Прапанову „Правды" цалкам падтрымліваем

«Правда» заклікае ўвесь нізавы і мясцовы друк правесьці з 10 па 15 сакавіка пяцідзёньнік праверкі гатоўнасьці да сяўбы механічнай і жывой цяглавай сілы.

Цалкам падтрымоўваючы прапанову «Правды» аб пяцідзёньніку праверкі і ўключаючыся ў яго падрыхтоўку і правядзеньне, газэта «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» заклікае ўвесь нізавы і раённы друк, усю армію сваіх рабселькораў прыняць актыўны ўдзел у гэтай рабоце і гэтым самым дапамагчы з посьпехам правесьці праверку падрыхтоўкі да сяўбы.

Уся падрыхтоўчая работа да пяцідзёньніка і самы пяцідзёньнік павінен быць праведзены ў самай цеснай увязцы з работай на правядзеньні раённых зьезтаў ударнікаў - калгаснікаў.

Саветы Случчыны адказваюць на зварот ударнікаў-калгаснікаў

Саветы Беларуйшчыны, прымеце выклік!

У адказ на заклік Усесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў саветы і калгасы Случчыны разгортваюць унутрыраённае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы.

З сакавіка на імя РК КП(б)Б і прэзыдыуму РВК паступіла письмо ад 5 старшынь сельсаветаў з прапановай арганізаваць унутрыраённае спаборніцтва саветаў, калгасаў, вытворчых участкаў, МТС з тым, каб да раённага зьлёту калгаснікаў - ударнікаў прыйсьці з поўнымі вынікамі падрыхтоўкі да сяўбы.

У спэцыяльным рашэньні па пісьму, бюро РК КП(б)Б і прэзыдыум РВК прынялі рад канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на разгортваньне сацспаборніцтва раёну. Гэтым-жа рашэньнем выклікан на сацспаборніцтва Бабруйскі раён. Для заключэньня ўмовы па сацспаборніцтву, 9-10 сакавіка ў Бабруйск выязджае група ўдарнікаў удзельнікаў Усесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў.

Вялікую ролю ў разгортваньні спаборніцтва адыгрываюць калгасы, дэлегаты якіх былі на Усесаюзным зьезьдзе калгаснікаў-ударнікаў. Справа здачы, гутаркі, аб зьезьдзе, уражаньні—такавы формы арганізацыйна - масавай работы сярод калгаснікаў, якую праводзяць ударнікі Усесаюзнага зьезду.

З сакавіка агульны сход калгаснікаў калгасу імя 1 Мая, распрацоўваючы адозву Усесаюзнага зьезду з пункту гледжаньня гатоўнасьці да сяўбы, выклікаў на сацспаборніцтва калгас імя Карла Маркса, прымушчана праз свайго дэлегата ўдарніцы тах. Кроль Марфы ўдзел у рабоце Усесаюзнага зьезду. Калгас імя 1 Мая абраў групу ударнікаў, якія выяжджаюць у калгас імя Карла Маркса для заключэньня сацумовы на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне сяўбы, а таксама падзелящца ўражаньнямі аб Усесаюзным зьезьдзе ўдарнікаў-калгаснікаў.

Другую групу ўдарнікаў калгас імя 1 Мая накіроўвае ў адзін з адстаючых калгасаў па падрыхтоўцы да сяўбы—калгас «Парыская Камуна». Агульны сход калгаснікаў даў буксірнай брыгадзе такі наказ:

Выявіць прычыны, чаму калгас «Парыская камуна» дрэнна рыхтуецца да сяўбы;

Перадаць вопыт сваёй работы, дапамагчы калгасу выйсьці з прарываў, выявіць клясава-варожыя элемэнты і дапамагчы ачысьціць ад іх калгас.

Аб усёй праробленай рабоце яны даложаць агульнаму сходу абодвух калгасаў.

Такім чынам, калгас імя 1 Мая да раённага зьлёту рыхтуе два рапарты: адзін—аб поўнай гатоўнасьці да сяўбы, а другі—гэта рапарт брыгады аб прычынах дрэннай падрыхтоўкі да сяўбы ў калгасе «Парыская Камуна» і практычныя прапановы па ліквідаваньню гэтага калгасу.

Для таго-ж, каб ня было сумненьняў у поўнай гатоўнасьці да сяўбы калгасу імя 1-га Мая, агульны сход пастанавіў 7 сакавіка правесьці спробны выезд у поле, запрасіўшы камісію з Райза, для праверкі і аказу ўсяго таго, што яшчэ не гатова да сяўбы ў калгасе.

ЯКУБ ПАЛІШУК.

Пашырым рады ўдарнікаў

Разгорнем усебеларускае спаборніцтва саветаў, па-баявому падрыхтуемся і правядзем веснавую сяўбу

(Адкрытае письмо групы старшынь сельсаветаў і калгасаў да прэзыдыуму Случцкага РВК і РК

У другой палавіне лютага закон чыў сваю работу Усесаюзны зьезд калгаснікаў - ударнікаў. З вялікім захапленьнем і зацікаўленасьцю сачылі мы за зьездам, прыслухоўваючыся да кожнага слова сталёвай гвардыі бальшавіцкага ЦК на чале з тав. Сталіным.

Гэты зьезд падняў сьцяг Усесаюзнага спаборніцтва рэспублік, краёў, абласьцей, раёнаў, МТС, саўгасаў і калгасаў на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы, абвясьціў заклік ударнікаў першай вясны другой пяцігодкі, ударнікаў лепшай работы, ударнікаў высокага ўраджаю.

І раён за раёнам ЦЧО, Паўночнага Каўказу, Крыму і Украіны ўключыўшыся ў сацспаборніцтва, пачалі на справе рэалізоўваць зварот Усесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў. У гэтай хвалі спаборніцтва не апошняе месца заняў саветы. Пад кіраўніцтвам партарганізацыі сельскія саветы сталі на чалі магутнага руху ўдарніцтва.

Вось тыя вялізарныя падзеі, якія адбываюцца зараз на фронце падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Восьчаму, пішучы гэта письмо, мы ня можам прайсьці мімо пытаньня—а што-ж робім мы ў сваім раёне? Як рэалізуюць зварот Усесаюзнага зьезду калгаснікаў - ударнікаў саветы Случчыны? Як ідзе падрыхтоўка да раённага і Усебеларускага зьезду калгаснікаў - ударнікаў?

І тут мы павінны з усёй бальшавіцкай рашучасьцю падкрэсьліць, што шмат якія саветы Случчыны (і ня толькі Случчыны, але і ўсёй БССР) аказаліся ў хвасьце такіх вялізарных падзей, як Усесаюзнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы. Шмат сельскіх саветаў яшчэ не ўзначаліў рух ударніцтва і спаборніцтва ў калгасах, працуюць старымі аджыўшымі мэтадамі работы, кіруюць калгасамі «наогул». І гэта прымушае нас зьвярнуцца з даным лістом да РК і прэзыдыуму РВК з тым, каб пры іх дапамозе карэнным чынам перабудаваць работу саветаў, павярнуць іх тварам да калгасаў, тварам да спаборніцтва.

Першым практычным крокам гэтага павароту павінна стаць міжраённае і ўсебеларускае спаборніцтва саветаў на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы. Прымаючы заклік Усесаюзнага зьезду калгаснікаў - ударнікаў, мы першымі ў раёне пачнем сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва саветаў.

У аснову сацспаборніцтва мы кладзем шчэ вагароў барацьбы за ўраджай, якія высунуты на сэсіі ЦВК наркомам земляробства СССР тав. Якаўлевым. Насеньне, севазвароты, сталая калгасная брыгада, добракасная апрацоўка зямлі, абавязковая сваячасовая пастаўка дзяржаве сельска - гаспадарчай прадукцыі—вось выходныя пункты нашага спаборніцтва.

Заключэньне сацдагавораў памж саветамі і калгасамі мы абавязуемся ператварыць у масавую самаправерку засыпкі насенных і страхавых фондаў, рамонту трактарнага і конскага парку, вывазкі гною, арганізацыі правільнага севазвароту і інш. мерапрыемстваў, што стаяць на даным этапе падрыхтоўкі да сяўбы.

Наш раён не з апошніх, што пабаявому выканалі загатоўкі; раён у асноўным не адстае і ў падрыхтоўцы да сяўбы. Аднак, на пазасобных участках падрыхтоўчай работы мы маем сур'ёзную небясьпеку, якая можа падарваць ўраджайнасьць.

Першая небясьпека—гэта ашуканьская, безлаберная работа на ўвядзеньню севазваротаў. Увядзеньне правільных севазваротаў—гэта бясспрэчная гарантыя павышэньня ўраджайнасьці. Як-жа мы адносімся да гэтай справы? Ці ўведзены севазвароты ў раёне? Брыгады НКЗ і Райза, што працавалі над севазваротамі, апошніх не распрацавалі і не ўвялі ў калгасах.

Другая небясьпека—гэта павольныя тэмпы вывазкі гною на 2 сакавіка выконан раёнам толькі на 10.3 пр.

Мы павялі рашучую барацьбу з засьмечанасьцю калгасаў, пачалі выкрываць і ачышчаць калгасы ад кулацтва і яго агентаў. Але і тут мы маем ня мала промахаў. Клясавы вораг хітры; кулак манэўрує прымаючы ўсе меры да таго, каб замаскавацца ў калгасе, прыкрыць свой твар, працягваць там сваю шкодную дзейнасьць. Гэтага не ўлічылі шмат якія саветы, шмат якія ўпяўпаваныя раёну, якія фармальна, бюракратычна правялі дзелі ачыстку калгасаў. І ня дзіва, што пасьля такой «чысткі» ў радзе калгасаў кулак застаўся незаўпаважаным.

Час пакончыць з такімі мэтадамі работы.

Разгортваючы сацспаборніцтва мы бярэм на сябе абавязак карэнным чынам перабудаваць работу сельскіх саветаў у адпаведнасьці з новымі задачамі, абвяшчаем заклік ударнікаў сельсаветскага актыву сэкцый і дэпутацкіх груп. З гэтай мэтай мы высоўваем задачу перад кожным членам савету, сэкцыянэрам — быць застрэльшчыкамі, ініцыятарамі ўнутрыкалгаснага спаборніцтва.

Для разгортваньня ўнутрыраённага і міжраённага спаборніцтва мы высоўваем прапанову — выклікаць на спаборніцтва саветы Бабруйскага раёну. Мы лічым важнейшай задачай—ператварыць падрыхтоўку да раённага і ўсебеларускага зьлёту ў масавую самаправерку выкананьня самаабавязацельстваў саветаў, саўгасаў, калгасаў, кожнага ўдарніка.

Мы зьвяртаемся да райза з прапановай прыйсьці на зьлёт з канкрэтна выпрацаванай праграмай спаборніцтва, устанавіўшы сустрэчныя тэрміны выкананьня сельска-гаспадарчых работ, увядзеньня севазваротаў, сустрэчныя нормы ўраджайнасьці па ўсіх галінах выключэньня культурах, а таксама вызначыць фонд прэміяваньня перадавікоў.

Усесаюзны зьезд калгаснікаў-ударнікаў, яго работа—лепшы прыклад таго, як трэба канкрэтна, пабальшавіцку змагацца за ўраджай. Зьезд абвясьціў заклік ударнікаў першай вясны другой пяцігодкі, ударнікаў высокага ўраджаю, дык давайце-ж на гэты заклік адкажам магутнай хваляй сацспаборніцтва і ўдарніцтва, па-бальшавіцку падрыхтуемся і правядзем веснавую сяўбу, гарантуем канкрэтныя паказчыкі павышэньня ўраджайнасьці.

Старшыні: Велікасьнёўскага, Серажскага, Іванэ - Гарадзецкага, Прошчыцкага, Лучнікоўскага сельсаветаў і калгасаў.

Старшыні сельсаветаў падпісваюць письмо Прэзыдыуму РВК і бюро РК КП(б)Б.

Раённае спаборніцтва саветаў

З пастановы прэзыдыуму Случцкага РВК і бюро РК КП(б)Б

Адабраючы письмо старшынь сельсаветаў аб арганізацыі ўнутрыраённага спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы, прэзыдыум РВК і РК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Прапанаваць ячэйкам і сельсаветам да адчыненьня раённага зьлёту калгаснікаў-ударнікаў разгарнуць шырокую палітычна-масавую работу па арганізацыі ўнутрыраённага спаборніцтва саветаў, калгасаў, саўгасаў, паставіўшы выходным пунктам абвешчаны Усесаюзным зьездам заклік ударнікаў першай вясны другой пяцігодкі.

2. Раённы зьлёт калгаснікаў-ударнікаў правесьці пад знакам праверкі гатоўнасьці да сяўбы, уцягненьня ў спаборніцтва ўсёй масы калгаснікаў і бяднякоў - серадняцкага сялянства.

3. Абавязаць Райза да дню адчыненьня раённага зьлёту выпрацаваць канкрэтныя ўмовы ўнутры раённага спаборніцтва, высунуўшы сустрэчныя лічбы ўраджайнасьці па зярнёвых культурах, бульбе і лёну.

У адпаведнасьці з рашэньнямі пленуму РК і РВК устанавіць 5 прэмій для лепшых сельсаветаў, першая прэмія—пераходны сьцяг імя РК КП(б)Б і РВК і чатыры грашовых прэміі ад 350—150 руб.

Прапанаваць праўленьню калгасаў стварыць грашова - натуральны фонд для ўнутры - калгаснага прэміяваньня лепшых брыгад і ўдарнікаў.

4. Выклікаць на спаборніцтва Бабруйскі раён. Для заключэньня сацумовы на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы з Бабруйшчынай 9-10 сакавіка камандыраваць групу ўдарнікаў—удзельнікаў раённага зьлёту.

5. Прапанаваць рэдакцыі газэты «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ» неадкладна разгарнуць работу па асьвятленьні ходу ўнутрыраённага спаборніцтва, на ўсіх без выключэньня вучастках і этапах барацьбы за ўраджай. Даючы паказ пры кладаў бальшавіцкага спаборніцтва перадавых, разам з гэтым газэта павінна бязьлітасна змагацца з пустой дэкларацыйнасьцю, лжэўдарніцтвам і інш. шкодными правямі, якія скажаюць прынцыпы сацыялістычнага спаборніцтва.

6. У мэтах шырокай папулярызацыі ходу міжраённага спаборніцтва з Бабруйшчынай, прасіць рэдакцыю газ. «Савецкая Беларусь» выслаць у раён брыгаду друку, якая-б забясьпечыла выпуск міжраённага апэрацыйнага бюлетэню спаборніцтва.

7. Рад фактаў засьмечанасьці калгасаў («Батрак», імя Молатава і інш.), што выяўлены за апошні час сапраўды падкрэсьліваюць слабую работу раду ячэек і сельскіх саветаў і паасобных упаўнаважаных з раёну ў справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, ачыстцы іх ад кулацкага і іншых антысавецкіх элемэнтаў. Адсюль задачы партячэек і саветаў карэнным чынам перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці рашэньняў ст дзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УСЕ КП(б)Б, мабілізаваўшы масу вакол зварот Усесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў, на бязьлітасную барацьбу з кулацтвам і яго агентурай.

8. Адзначаючы пагрозу зрыва расцвяцоўкі вясеньніх севазваротаў, для калгасаў, факт, які яшчэ раз падкрэсьлівае надзвычайна слабую работу зямельнага апарату РВК, прапанаваць Райза неадкладна прыступіць да даваньня севазваротаў, да калгасаў, мабілізаваўшы на гэтую справу ўсіх спэцыялістаў і раённы актыў.

Ачысьціць апарат Наркамасьветы Беларусі ад клясавага ворага

(Ад менскага карэспандэнта „Правды")

Контррэвалюцыйную сутнасьць беларускага нацыянал дэмакратызму на шматлікі даўно ўжо выкрылі.

У свой час клясавы вораг дзейнічаў адкрыта. Беларускую акадэмію навук ён ператварыў у аплот сваёй контррэвалюцыйнай дзейнасьці. На чале якадэмічнай стаяў «свой» чалавек—дэфэлёг кулака нацыянал дэмакрат Ігнатоўскі. Кулацкі ўплыў пранік у Наркамат асьветы: У Наркамасьветы «работаў» нац дэмакрэцкі мракабес Балицкі. Тэатр, універсытэт, выдавецкая справа і нацыя вучэбна нацыянальна - культурнага будаўніцтва клясавы вораг, кары стаючыся актыўнай падтрымкай сваёй агентуры ў партыі—нацыянал апартуністых—імкнуўся прыбраць да сваіх рук. Але намаганьнямі нашай партыі, пры актыўнай падтрымцы працоўных мас Беларусі, контррэвалюцыйны нацыянал дэмакратызм быў выкрыт і разгромлен. І нацыянальна-культурны фронт быў вычышчан ад агентаў польскага шпіёнажу.

Прайшло некалькі год. Клясавы вораг зноў рашыў разгарнуць барацьбу супроць савецкай улады. Але ўжо не адкрыта, а цічай сапай, за сьпіной некаторых «камуністаў», якія згубілі партыйную пільнасьць.

Асабліва яна сказалася рэцэдывы нацыянал дэмакратызму ў апараце Наркамасьветы Беларусі.

«Правда» 3 лютага ў артыкуле «Пад фальшывым нацыянальным сьцягам» сьцягаўзавала КП(б)Б аб вылазках контррэвалюцыйнай нацдэмаўшчыны. Па гэтаму сьцягалу і дырэктыве ЦК Беларусі Менскі гарком партыі прыступіў да абсьледваньня работы Наркамасьветы. Аказалася, што апарат Наркамата моцна засьмечан нацдэмаўскімі і іншымі антысавецкімі элемэнтамі.

Галоўмастацтва. У апараце няма ніводнага камуніста. Аддзелам «кіруе» нейкая Канстрон, якая нават не зьяўляецца членам прафсаюза.

Галоўлітам фактычна кіруе Гарбуз. Па думцы Наркома тав. Платуна, Гарбуз работае на два фронты: і нам і нацыянал-дэмакратам». Гэты «двуглі Янус» працыдзіў у друк контррэвалюцыйныя творы Сідарэнкі, Баранавых і іншых. Тым ня менш Платун чамусьці заканаў Гарбуза ў апараце Наркамасьветы.

Плянава - статыстычным сэктарам ведае Сьцяпура. Ён скончыў духоўную акадэмію і быў пры царызьме на спэктарам школ па Ковенскай губ. Быў ближэйшым саратнікам былога Наркамасьветы Балицкага выкінутага з партыі за актыўны нацыянал-дэмакратызм. Работу Сьцяпура ніхто не правяраў. Карыстаецца неабмежаваным давер'ем. Работай сэктара ня цікавіцца, у сэктары панучэйная анархія:

Такое-ж становішча ў фінансава-эканамічным сэктары Наркамата.

На чале сэктару стаіць былы падрадчык Зьвянчык у свой час верны «спо движник» таго-ж самага Балицкага.

Нарком тав. Платун зрук вон дрэн на кіруе апаратам. Работай сэктароў ніхто ня цікавіцца, работнікаў апарата Наркома ня ведае. Гэткія адносіны да кадраў прынялі да таго, что нацыянал дэмакратаў прыцягнулі да складаньня праграм па мове (Бандаровіч).

Скарачэньне апарату было скарыстана для ачышчэньня яго ад... камуністаў. Так напрыклад з Галоўліта сакрацілі члена партыі Барановіч, а пакінулі Гарбуза; у плянна-статыстычным сэктары сакрацілі камуніста Бурачкова, а пакінулі Сьцяпура і т. д.

Ня дзіўна, што пры гэткай сыстэме падбору кадраў органы Наркамасьветы не забясьпечаюць чоткага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі.

Дзяржаўны навуковы савет ў выніку калатных адносін да падбору навуковых выкладчыкаў кадраў даў магчымасьць з катэдры ВНУ і ВТНУ пропаґаваць трацкісцкую контрабанду (Гесэн, Рыўлін, Айзэнбэрг, і ін.). Айзэнбэрг, кіраўнік катэдры палітэканомі і тэорыі савецкай гаспадаркі адкрыта карыстаючыся трыбунай катэдры фрасэтлумачаў «савецкі гандаль ад адступленьне нашай партыі.

Некалькі слоў аб праграмах для масавай школы. Усе праграмы былі «зацьверджаны», а па сутнасьці справы праштампаваны калегіяй Наркамасьветы разам з ДВС апушам у тры дні.

Значная частка праграм пішам ня чыталася і непасрэдна вётарамі здавалася ў друкарню пасьля чаго выпускалася ў школьную сетку.

У праграме па гісторыі зусім абыйдзена клясавая барацьба, як рухаючая сіла ў разьвіцьці грамадзкіх фармацый.

У складаньні праграм па мовазнаўству з бласлаўленьня Наркамасьветы ўдзельнічаў усім вядомы нацыянал-дэмакрат Бандаровіч. І таму ня дзіва, што ў праграме няма нават намёку на барацьбу з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму як галоўчай небясьпекі, і ў бок беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму.

Фактычны кіраўнік Галоўліту Гарбуз пры прамым папусьпічэльстве тав. Платуна садзейнічаў антыпралетарскім элемэнтам тыпу Нікановіча, Сідарэнкі-Пенаціна, Баранавых друкаваць сваю контррэвалюцыйную галімацьню.

У поўным сутычы з гэткай «работай» Наркамату працякала дзейнасьць партячэйкі.

Ячэйка ачысткай апарату ад нацдэмаўскіх элемэнтаў не займалася. Работу камуністаў у сэктарох не правярала. Нядаўна па пытаньням нацыянальна-культурнага будаўніцтва была прынята чарговая рэзалюцыя ў якой між іншым трацкізм кваліфікуецца не як перадавы апрад міжнародпай контрэвалюцыі, а як «ухіл ад лініі партыі».

20 лістапада мінулага году ячэйка прымае адпаўную рэзалюцыю ў якой гаворыцца:

«Аоноўныя сэктары Наркамасьветы свячас

Падрыхтоўка да зьлётаў калгасьнікаў-ударнікаў--

масавы агляд баявой гатоўнасьці да сяўбы

НОВЫЯ СОТНІ і ТЫСЯЧЫ КАЛГАСЬНІКАЎ--У РАДЫ УДАРНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПАЛЁЎ

„Мы хоць і сёньня гатовы выйсьці ў поле“

Пасьля выкананьня абавязкаў перад дяржавай, калгас «Галошава», Коханаўскага сельсавету, Талочынскага раёну, па-баявому распачаў падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Пасьля рас працоўкі пастановы ЦК і ЦКК, а таксама праграмнага дакуманту—прамовы тав. Сталіна «Аб рабоце ў вёсцы», актыўнасьць калгасьнікаў яшчэ больш узрасла ў барацьбе за ўдарную падрыхтоўку да сяўбы.

У адказ на пастанову партыі калгас поўнасьцю выканаў плян засыпкі насенных і страхавых фондаў, закончыў ачыстку насеньня.

Для падняцьця ўраджайнасьці сабрана 3 цнт. попелу, амаль поўнасьцю закончана вывазка гною, зроблена праверка ўсхожасьці насеньня. Прыведзен у гатоўнасьць увесь сельска-гаспадарчы інвэнтар. Калгасьнікі заяўляюць: «Мы хоць і сёньня гатовы выйсьці ў поле». У выніку распрацоўкі пастановы ЦК і СНК «Аб захаваньні конскага пагалоўя», у калгасе устаноўлен празільны догляд за коньмі. Зараз коні замацаваны за брыгадамі і асобнымі калгасьнікамі. У нас цэнтэзуце рэгулярна асьвятляецца работа брыгад па догляду за коньмі, выкрываюцца хворыя бакі ў гэтай рабоце.

Плян лесазагатовак і лесавывазкі калгас выканаў на 125 проц.

23 лютага ў адзнаку гадавіны РСЧА калектыў калгасьнікаў арганізаваў чырвоны абоз па вывазцы лесу.

Калгас выклікаў на спаборніцтва на хутчэйшае і лепшае правядзеньне веснавой сяўбы, падняцьце ўраджайнасьці калгасы: «Кастрычнік», «Багда наўку» і «Пабедзіцель».

Выкліканыя і астатнія калгасы Талочынскага раёну павінны пасьледаваць прыкладу калгасьнікаў калгасу «Галошава», узьняць сваю актыўнасьць на баявую падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

П. Ч.

Да сяўбы гатовы

КЛІМАВІЧЫ. (Ад нашага карэспандэнта). Пад кіраўніцтвам партячэйкі калгас імя ВАРАШЫЛАВА, Склімінскага сельсавету, яшчэ 23 лютага быў гатоў да сяўбы.

Насенныя і страхавыя фонды ў колькасьці 508 цнт засыпаны, анышаны і добра захаваны. 113 рабочых коняй у здавальняючым стане і забясьпечваюць сваячасовае правядзеньне веснавой сяўбы. Сельска-гаспадарчы інвэнтар падрыхтаваны. Ёсьць неабходных і адрамантаваных: плугоў—93, борон—85, калёс—74, хамутоў—216, вожкаў—136.

Арганізован агранамічны гурток які ахвотна наведваюць калгасьнікі.

Я. ВЕРБІН.

Вораг яшчэ ня выкінут з калгасу

ВІЦЕБСК. Калі верыць зводцы—засыпка насеньня наближаецца да канца. Але на самай справе з засыпкай насеньня становішча пагражаючае. Рад сельсаветаў і калгасаў займаюцца простым очкаўціральствам. Так, старшыня калгасу імя Браслаўскага (Замастоцкі сельсавет) Галубцоў даў весткі аб тым, што калгас поўнасьцю засыпаў насеньне віку, а пры праверцы аказалася, што віка нават яшчэ не абмалочана. Такія-ж факты наглядаюцца і па Рудкоўскім сельсавеце.

Зусім мала ўвагі ўдзяляецца ачыстцы насеньня. Між тым, з засыпаных ужо зярнёвых культур—ачышчана толькі 66,3 проц., тэхкультур—65,4 Віцебскі, Бараўлянскі і Сямоцкі сельсаветы яшчэ нават не прыступілі да ачысткі насеньня. Гарсавет ня ведае аб сапраўдным становішчы з засыпкай насеньня на мясцох.

Рад фактаў сьведчаць аб кулацкіх шкодніцкіх справах у некаторых калгасах пры стварэньні насенфондаў. У калгасе «3-ці рашаючы» (Барыніцкі сельсавет) нехапае значнай колькасьці насеньня. А між тым калгасьнікам разданы 16 цнт. ячменю. Рахункавод калгасу—сын кулака Радкевіч, утаіў і не правёў па кнігах 12 цнт. збожжа, якія былі прызначаны, як насеньне. Калгас «Сілач» (Даўжынскі сельсавет) ня вызначыўшы насенфонды, ужо разьмеркаваў 70 проц. збожжавых культур. Па калгасе «Бяроза» (В. Летчанскага сельсавету) раскрадзена каля 100 цнт. збожжа і 560 цнт. бульбы. Засыпанае насеньне дрэнна захоўваецца. Па калгасах імя Сталіна і Калініна ячмень і пшаніца засыпаны без папярэдняга сартаваньня і ў выніку сапсавалася. У калгасе «Замасточча сапсавалася шмат насеннай бульбы.

Становішча з выкананьнем пляна засыпкі небясьпечнае. Патрэбны рашучыя і тэрміновыя меры. Патрэбна ў першую чаргу рашуча ачысьціць калгасы ад кулацкага элемэнту, бязьлітасна ўдарыць па ачкаўціральцах—агентах кулака. Віцебскі гарсавет павінен неадкладна рэагаваць на пададзеныя вышэй факты кулацкага саботажу ў зборы насеньня.

Б.

УДАРНА РЫХТУЮЦЦА ДА СЯЎБЫ.

НА ЗДЫМКУ: Заканчваюць рамонт сеялак.

Выкрыць шкодніцтва ў устанаўленьні севазваротаў

Кіраўніцтва Магілеўскай МТС не забясьпечыла выкананьня пляну засыпкі насенных і страхавых фондаў ў калгасах, якія ёю абслугоўваюцца, у выніку начананы партыяй і ўрадам тэрмін. Плян засыпкі выкананы калгасамі зоны МТС: па зярнёвых на 91,6 проц., тэхнічных—82,2 проц. і па бульбе на 98,4 проц.

Значна горш стаіць справа з засыпкай насеньня кармовых траў: вікі засыпана ўсяго 60,5 проц. пляну, а па засыпцы канюшыны зусім няма зьвестак. Насеньне ня ўсё ачышчана. Аграномы ня цікавяцца работай па ачысткі насеньня, праверцы яго ўсхожасьці, як ідзе гэта работа—ніводны аграном МТС ня ведае; падліку гэтай справы не вядзецца.

На пытаньне брыгады друку, як ідзе праверка засыпкі насенных і страхавых фондаў па калгасах, намесьнік дырэктара МТС—Румілаў зьдзіўлена адказаў: «Райком партыі правядзіць праверку». Тым часам, у шмат якіх калгасах («Чырвоны сормавец», «Першае мая» — Сялецкага сельсавету, «Авангард», «Першае мая»—Княкіцкага сельсавету) ёсьць вялікі недахоп насеньня зярнёвых і інш. культур. Перш чым стварыць насенныя фонды, у шмат якіх калгасах зроблена разьмеркаваньне прыбыткаў, і гэта ў МТС лічаць правільным. Праўда, у МТС ёсьць людзі, якія апраўдваюцца. Так, аграном Бэрман у сваё апраўданьне заяўляе: «МТС такіх разьмеркаваньняў ўраджаю не зацьвярджае». Усё-ж факты сьведчаць аб тым, што насенныя фонды не засыпаны, разьмеркаваньне зроблена, хоць і сяз ведама МТС.

Зараз у некаторых калгасах ёсьць лішкі насеньня, але не арганізоўвецца ўзаемадапамога насеньнем паміж калгасамі.

Такое становішча і з вывазкай гною.

Плян зімовай вывазкі гною калгасамі МТС выканан усяго на 39,5 проц., а збор попелу на 42 проц. Гэта важнейшае мерапрыемства ў барацьбе за ўзьняцьце ўраджайнасьці знаходзіцца пад яўнай пагрозай зрыву. Сярод калгасных мас не праведзена масавая работа, не ўзьнят актыў калгасьнікаў на барацьбу з кулацкай агітацыяй, на кіраванай на зрыў мерапрыемствах па падняцьцю ўраджайнасьці.

З 56 калгасаў МТС зямлеўпарадкавана толькі 12. На сёньня ні ў вадным калгасе ня ўведзен правільны севазварот. Толькі ў 25 проц. калгасаў абгавораны праекты севазвароту. Аграномы МТС пры праектаваньні севазвароту для калгасаў узялі зусім шкодны напрамак — пайшлі на зьмяншэньне пасеву зярнёвых культур. Па запраектаванаму пляну севазвароту атрымоўваецца зьмяншэньне пасеву зярневых культур на 240 га. Каб замацаваць гэтае яўнае парушэньне дырэктыў партыі і ўраду аграном Бэрман імкнецца апраўдацца тым, што калгасы засеюць замест гэтай плошчы зернёвага кліну, у садох і гародах гарох.

Вышэйпералічаныя факты з усёй яскравасьцю сьведчаць аб тым, што цяперашнае кіраўніцтва МТС і партячэйка не мабілізавалі калгасныя масы на падрыхтоўку да сяўбы. Наадварот, кіраўніцтва МТС, прыкрываючыся рознымі «аб'ектыўнымі» прычынамі тармозіць выкананьне найстражэйшых дырэктыў партыі і ўраду аб падрыхтоўцы і пасьпяховым правядзеньні веснавой сяўбы.

Павінны быць прыняты тэрміновыя меры. Баявы ўчастак калгаснага будаўніцтва — МТС ня можа цярпець ні якіх адставаньняў. Павінна быць створана баяздольнае, бальшавіцкае кіраўніцтва, якое-б забясьпечыла авангардную ролю калгасаў МТС у падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой сяўбы першага году другой пяцігодкі.

РКК РСІ павінна зараз-жа зрабіць адпаведныя вывады і прыняць тэрміновыя меры для ўмацаваньня кіраўніцтва МТС і партячэйкай.

Брыгада: ГЛУШАНСКІ, СКАПЕЦ.

Калгас „Ларынаўка“ дабіўся права на рапарт зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў

БОРША. Калгас «Ларынаўка» сустракае раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў падрыхтаваным да сяўбы. «Мы не апошнімі ідзем да раённага зьлёту»—заяўляюць калгасьнікі гэтага калгасу. Калгас поўнасьцю засыпаў збожжавыя культуры (206 проц.), усё насеньне ачышчана і добра захоўваецца. 28 калгасных плугоў ужо адрамантаваны, калгасны транспарт і збруя — у поўнай гатоўнасьці. Да кожных 11 коняй прымацаваны конюх, а пры рабоце да кожнай пары коняй прымацован калгасьнік. Калгас поўнасьцю забясьпечан фуражом.

Ужо сабрана тры тоны попелу, замест вызначаных па пляну 2,6 тоны. Па калгасныя палі вывезена 1.200 вазоў гною. Для аўладаньня агратэхнікай арганізаваны гурток для калгасьнікаў і брыгадзіраў. Калгас праводзіць самаачыстку ад чужацкіх элемэнтаў. Ужо вычышчаны з калгасу былы кулак Бадаеў і гультаі сымулянты МАЧУЛЬСКІ і ДАШКЕВІЧ, якія па-барбарску адносіліся да коняй калгасу.

У распрацоўцы пастановы СНК і ЦК аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы прымалі ўдзел усе калгасьнікі калгасу «Ларынаўка».

(БЕЛТА).

Сустрэць сяўбу ва ўзброеньні

(Ад нашага Б бруйскага карэспандэнта)

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў каапгасах лесакамбінату швэйнай фабрыкі і інш прадпрыемстваў знаходзіцца пад яўнай пагрозай зрыву. Вывазка гною і мінэральных угнаенняў зрываецца з прычыны злачыннага ўтрыманьня цягавай сілы і дрэннага яго скарыстаньня. Так, у каапгасе ЦРК да гэтага часу вывезена толькі 10—15 проц. гною. Такое-жа становішча з вывазкай гною і па каапгасе камбінату.

Злачынныя адносіны да цягавай сілы, абязьлічка ў доглядзе за коньмі прывяла да таго, што ў каапгасе ЦРК некалькі коней зусім палі. Астатнія коні ня толькі ня могуць забясьпечыць вывазкі ўгнаеньня на палі каапгасу, але нават знаходзяцца пад яўнай пагрозай выхаду са строю. Прычыны такога ганебнага становішча заключаюцца ў тым, што кіраўнікі каапгасаў сваячасова не забясьпечылі коняй кармамі і ў сучасны момант таксама ня думаюць аб гэтым.

Адным з рашаючых момантаў у падгатоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі ў прыгарадных гаспадарках зьяўляецца вырашчваньне раньняй гародніны, закладка парнікоў. Да гэтага часу гной на парнікі павінен быў быць ужо вывезены, але ў каапгасе ЦРК вывезена толькі 50 проц. патрэбнай колькасьці гною, а па каапгасе лесакамбінату яшчэ менш.

Каб да ўсяго гэтага дадаць пагражаючае становішча ў справе засыпкі насенных фондаў, дык становіцца зусім зразумелым, што як кіраўніцтва каапгасаў, так і Бабруйскі райпрафсавет, апартуністычна недаацэньваюць неабходнасьць разгортваньня ўдарнай падрыхтоўкі да сяўбы і імённа безадкладна.

Гэтымі днямі павінен адбыцца Бабруйскі раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў. Падрыхтоўка да яго павінна быць пераломным момантам у падрыхтоўцы бабруйскіх каапгасаў і прыгарадных гаспадарак да веснавой сяўбы.

Веснавая пасеўная кампанія павінна быць сустрэнута ва ўсеўзбраеньні.

А. ДАМБРОЎСКІ.



НА ЗДЫМКУ: Каўпэры і паветраправады рэканструяванай домны № 5 (Варашылаўск, Данбас).

Усебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў сустрэнем добра падрыхтаванымі

Прыгарадная гаспадарка торфазаводу «Шлях сацыялізму» (гор. Добруш) налічвае 100 га зямлі; апрача таго, у гэтым годзе пасеўная плошча гаспадаркі павялічваецца яшчэ на 20 га.

Асабліва дрэнна ў мінулым годзе сталла справа з ураджайнасьцю палёў, якая была вельмі нізкая. У гэтым годзе перад гаспадаркай пастаўлена баявая задача—павысіць ураджайнасьць на 25 проц. Для рэалізацыі гэтага мерапрыемства ў прыгарадной гаспадарцы нічога ня робіцца. Рашэньні партыі і ўраду аб павышэньні ўраджайнасьці не даведзены да шырокіх рабочых мас прыгарадной гаспадаркі. Плян вывазкі гною выкананы толькі на 20 проц. Дрэнна забясьпечана гаспадарка насеньнем. Нават яшчэ не маецца вытворчых пляноў па сяўбе. Не хапае яшчэ 15 цнт. аўса, 20 тон бульбы, 75 кпр. гароху і інш. гародніна насеньня. Насеньне, якое ёсьць на складах, не прачышчана і захоўваецца ў вельмі дрэнным месцы.

Дрэнна і з фінансавымі справамі гаспадаркі. Калі торфсэкцыя Белкаапсаюза тэрміново не адпусьціць адпаведную суму грошай на закупку насеньня, дык веснавая пасеўная кампанія ў гаспадарцы пад пагрозай зрыву. Акрамя гэтага трэба ўзмацніць транспарт, бо тыя 10 коняй, якія мае гаспадарка ня здольны задаволіць тыя вялізарныя патрэбы, якія яна адчувае ў цягавай сіле. Адміністрацыя торфазаводу з усім гэтым згаджаецца, але ні якіх канкрэтных мер для ліквідацыі гэтага становішча ня прымае.

Адміністрацыя торфазаводу і торфсэкцыя Белкаапсаюзу павінна ўжыць тэрміновыя меры, каб забясьпечыць сваячасовую падрыхтоўку прыгарадной гаспадаркі да вясны.

Усебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў прыгарадная гаспадарка павінна сустрэць добра падрыхтаванай да сяўбы.

М. Левікаў.

Т. Казінец Майсей лепшы ўдарнік калгасу «Чырвоны бераг», прэм'яваны за добраякасную работу ў калгасе і грамадзкую працу.

Зводка засыпкі насенных фондаў калгасамі БССР на 3 сакавіка г. г.

(у процантах)

Назва раёнаў	Зярнёв. культ.	Лён	Бульба
Лёнамалочныя раёны			
Талочынскі	120,8	97,6	132,0
Дрысенскі	110,3	60,0	119,2
Асьвейскі	100,7	88,0	112,0
Дубровенскі	100,5	85,1	109,0
Мсьціслаўскі	109,2	84,0	105,1
Расоўскі	104,7	75,5	103,1
Сенньненскі	104,2	72,7	99,7
Лепельскі	104,0	71,8	98,5
Сураскі	100,1	60,9	95,1
Бялынецкі	99,8	55,8	93,4
Горацкі	93,7	52,4	52,3
Вушацкі	92,5	58,6	91,7
Крупскі	98,8	53,1	98,0
Чэрвуські	96,7	53,1	67,5
Лёзьненскі	95,8	49,2	87,3
Полацкі	94,8	45,7	87,3
Чашніцкі	94,6	41,2	78,8
Бешанковіцкі	88,3	34,0	88,7
Гарадоцкі	50,9	33,9	77,0
Шклоўскі	86,0	58,7	74,9
Сіроцінскі	78,6	32,8	82,2
Жывёлагадоўчая бульбяная раёны			
Бягомльскі	116,2	130,0	113,4
Чырвона-Слабодзкі	109,6	132,4	108,3
Стара-Дароскі	106,4	111,9	103,3
Крычаўскі	106,1	107,0	103,1
Пухавіцкі	105,7	106,7	101,9
Чачэрскі	103,2	103,5	100,9
Смалявіцкі	104,3	103,4	100,0
Лагойскі	104,0	102,1	100,0
Барысаўскі	102,4	100,5	99,1
Карміянскі	102,8	92,6	99,0
Чачарскі	101,9	97,9	97,1
Церахоўскі	101,2	98,9	96,3
Рагачэўскі	100,4	96,7	95,2
Капыльскі	99,9	93,6	94,3
Асіпавіцкі	99,6	96,5	92,3
Заслаўскі	99,6	93,2	92,0
Слуцкі	99,6	92,6	9 ,9
Касьцюковіцкі	99,7	91,1	91,8
Клімавіцкі	98,0	90,6	91,4
Клічаўскі	97,8	86,9	91,2
Вузьдзенскі	96 ,8	5 ,1	91,1
Плешчаніцкі	83,4	89,9	
Чэрвеньскі	83,6	82,0	69,5
Жлобінскі	93,4	83,2	69,2
Дяржынскі	25,1	78,6	89
Быхаўскі	90,6	77,1	88,3
Буд.-Кашалеўскі	93,5	78,4	85,3
Чырвонапольскі	90,3	67,4	84,1
Прапойскі	93,6	66,0	83,1
Бярэзінскі	92,3	65,0	83,0
Уваравіцкі	87,5	58,5	81,9
Веткаўскі	65,2	58,9	80,7
Жывёлакананпляводныя раёны			
Рэчыцкі	118,5	155,2	99,0
Хойніцкі	117,8	154,8	97,4
Старобінскі	114,5	143,6	96,0
Глускі	109,9	140,6	94,1
Ельскі	108,2	139,3	93,7
Жыткавіцкі	107,6	127,8	92,1
Лельчыцкі	107,6	117,9	91,5
Лоеўскі	106,2	115,9	90,9
Парыцкі	98,0	112,1	69,4
Нараўлянскі	97,4	112,0	89,1
Мазырскі	97,1	103,6	88,4
Брагінскі	96,5	88,9	86,3
Турэўскі	93,7	87,8	84,3
Петрыкаўскі	91,6	82,6	86,3
Любаньскі	91,2	79,8	76,5
Камарынскі	89,7	77,4	73,4
Садова-гародн. раёны			
Віцебскі	109,0	133,9	103,3
Бабруйскі	104,4	112,5	99,8
Аршанскі	104,3	100,0	99,8
Менскі	102,2	86,8	97,3
Гомельскі	96,1	70,0	96,4
Магілеўскі	94,3	67,3	95,1
Разам па БССР:	103,3	73,2	94,0

Кір. сэктару ўліку і справаздачнасьці НКЗБ — ВАЙЦОК

„І лён будзе дзе мачыць, і ураджай павысім“

Добра ўгноеная глеба, сваячасовы пасеў і дабраякаснае насеньне — вось залог высокага ўраджаю. Гэта добра зразумелі калгасьнікі калгасу «Ільліч», Галубаўскага сельсавету (Дрысенскі раён). Побач з ударнай работай па адрамантаваньню сельска-гаспадарчага інвэнтару, ачыстцы насеньня і падрыхтоўцы моцнай цягавай сілы да веснавой сяўбы, калгасьнікі рашылі правесьці веснавую сяўбу выключна на добра ўгноенай глебе.

Калгасьнікі «Ільліча» паставілі перад сабой задачу: скарыстаць на сваіх палёх усё адпушчанае ім мінэральнае ўгнаеньне, увесь гной з пад жывёлы і сабраны попел. Але пасьля падліку ўсіх запасаў угнаеньня і наяўнай зямлі аказалася, што ўсё-ж такі ўгнаеньня поўнасьцю ня хопіць. І з гэтага, аднак, палажэньня калгасьнікі знайшлі выхад. Яны адшукалі мясцовы прыродны запас угнаеньня.

Вялікая сажалка, што скарыстоўвалася для мочыва лёну, з цягам часу зарастала цінай, якая гніла і спадала на дно сажалкі. Такім чынам, на працягу шмат гадоў гэта вялікая, глыбокая сажалка ўся напоўнілася багатым перагноем і стала няпрыгоднай для мочыва лёну. І вось гэты перагной калгасьнікі ўзяліся вычарпаць і вывезьці на поле.

З аднаго вала дзьве скуры зьдзярэм,—гавораць калгасьнікі,—і лён будзе дзе мачыць, і ўраджай павысім.

Калгасьнікі «Ільліча» раяць усім калгасам вычэрпваць з сажалак гэты каштоўны перагной для скарыстаньня яго ў якасьці дадатковага ўгнаеньня.

К. БАРТАШЭВІЧ.

Прыгарадныя гаспадаркі дрэнна рыхтуюцца да вясны

Прыгарадная гаспадарка „Спартак“ сустракае вясну з пустымі рукамі

Першае рашэньне аб арганізацыі прыгарадной гаспадаркі пры ЗРК Шклоўскай папяровай фабрыкі «Спартак» было вынесена на паседжаньне бюро Шклоўскага камітэту партыі 23 жніўня 1932 г. Бюро РК прапанавала райсавету скласьці камісію для адводзіньня 150 га зямлі для гэтай гаспадаркі, з якіх 30 га сенажаці.

Але райсавет не пасьпяшыла з вылучэньнем камісіі і адводзіньнем зямлі. Урэшце, праз чатыры месяцы—23 сьнежня 1932 году камісія была вылучана ў складзе трох асоб: ад райсавету, гарсавету і фабрыкі «Спартак». Прычым, прадстаўнік фабрыкі «Спартак» не згаджаўся на адводзіньне плошчы толькі ў 150 га зямлі, бо кіраўніцтва фабрыкі і парткалектыў лічылі гэтую плошчу мінімальнай і патрабавалі больш шую. Просьба была задаволена. Зямля адведзена. Але як? Закон аб устойлівым землякарыстаньні быў забыты—зямля адведзена ў пяці асноўных і 10 дробных—параскіданых па ўсім горадзе і яго прыфэрыі вучастках. Такім чынам прыгарадная гаспадарка была «арганізавана». Але кіраўніцтва гэтай гаспадаркай вылучана ня было і да гэтага часу яшчэ няма ні дырэктара, ні праўленьня.

Аб нараджэньні новай прыгарадной гаспадаркі ў горадзе Шклове пры фабрыцы «Спартак» даведаліся Белпапертрэст і Сельгасаб'яднаньне пры Белкаапсаюзе. І пачалася па гэтаму выпадку «бамбардыроўка» фактычна ня існуючай прыгарадной гаспадаркі. Адзін за адным паляцелі з Менску цыркуляры, справаздачныя бляшкі і т. д.

У пачатку студзеня г. г. з Сельгасаб'яднаньня Белпапертрэсту дасылаецца паперка цыркуляр—вывезьці на поле 1056 тон гною, з разьмеркаваньнем пад якія культуры, колькі ў якім месяцы павінна быць вывезена.

25 студзеня была прыслана дырэктыва—даць заяўку на соль для гаспадаркі; 10 студзеня—заключыць дагавор на атрыманьне насеньня і рад інш. сур'ёзных і катэгарычных паперак—дырэктыў з Белсельаб'яднаньня.

Усе атрыманыя з Менску паперкі сакратар праўленьня ЗРК фабрыкі тав. Крупенька акуратна падшываў да справы, адначасова «адстрэльваючыся» такімі адказамі: «Паведамляем, што справаздачныя бляшкі аб ходзе падрыхтоўкі да сяўбы намі атрыманы. Гной ня вывозім таму, што няма сродкаў, набыць цягавую сілу і трактары». Такая «страляніна» паперкамі працягваецца і па сёньнішні дзень.

Гаспадарка ня мае ніякіх сродкаў для разгортваньня падрыхтоўчай работы да веснавой пасеўнай кампаніі. З самага пачатку арганізацыі гаспадаркі Белпапертрэст наабяцаў шмат чаго, а галоўнае—абяцаў адпусьціць па каштарысу на першапачатковыя выдаткі на арганізацыі гаспадаркі 90.000 руб. Грошы яшчэ і да гэтага часу не атрыманы, але затое, абяцаюць «гэтымі днямі» выслаць 20.000 руб. і не колькі кілё паперы на перапіску з Белпапертрэстам.

Веснавую сяўбу гаспадарка сустракае з пустымі рукамі. Няма яшчэ ні воднага каня, ніякага інвэнтару, ніводнай тоны гною, мінэральных угнаеньняў і насенных матар'ялаў ніякай падгатоўчай работы па баявой сустрэчы вясны не праводзіцца. Праўда складзены плян сяўбы, згодна якога трэба засеяць 45 га гародніны, каля 60 га бульбы, а астатня—кармавымі і збожжавымі культурамі.

Гаспадарка патрабуе хуткай канкрэтнай дапамогі. Гэту дапамогу ёй павінен неадкладна аказаць Шклоўскі РК КП(б)Б.

Брыгада газэт «Голас Спартакаўца» і «Савецкая Беларусь» М. Грыгор'еў, М. Мядзьведзеў.

Рапартаваць зьезду аб перамозе

Дрэнна рыхтуецца да сяўбы Менскі прыгарадны саўгас імя Лекерта. Плян веснавой пасеўнай кампаніі і наогул прамфінплян на 1933 год яшчэ не даведзены да кожнага ўчастку брыгады і паасобнага рабочага. Брыгады яшчэ і да сёньнішняга дню не прымацаваны да ўчастка работы. Асабліва дрэнна стаіць справа з засыпкай насенных фондаў. Паасобнымі відамі насеньня саўгас забясьпечаны цалкам і нават з лішкамі, а некаторых культур як напрыклад цыбулі не хапае 2 тон. Не хапае яшчэ і насеньня раньняй капусты, часнаку і інш.

Плян вывазкі мінэральных угнаеньняў ганебна зрываецца. Ня гледзячы на неадназразовыя сыгналы друку, справа ня кратаецца з месца. Па пляну трэба было завезьці 13 тон азотных угнаеньняў, але яшчэ не завезена ніводнага кілёграма; фосфарных угнаеньняў замест 50 тон завезена толькі 18; калійных—замест 30 тон завезена 9. Гарпрафсавет, гарсавет, ЗВК, да якога саўгас прымацаваны, праяўляюць поўную бязьдзейнасьць.

Ня лепш і з вывазкай арганічных угнаеньняў. Згодна пляну, саўгас павінен быў вывезьці 7.000 тон, але не становішчу на 22 лютага вывезена толькі 2.876 тон, або 40,6 проц. заданьня. Пад гародныя культуры трэба вывезьці 2.980 тон, на 22 лютага вывезена толькі 701 тона, або 23,5 проц. Пад палявыя культуры замест 9600 тон, на 22 лютага вывезена толькі 880 тон, або 32 проц. да пляну. На парнікі трэба было ўжо вывезьці да 20 лютага 1.500 тон, а вывезена ўсяго толькі 85 проц. заданьня. З прычыны чаго закладка парнікоўых рам пад пагрозай зрыву. З 20 лютага па 10 сакавіка патрэбна закласьці 2.000 рам, на 22 лютага закладзена толькі 220 рам, або 10 проц. да пляну. Замест таго, каб закладаць кожны дзень каля 200 парнікоўых рам — штодзенна закладваецца па 45 рам.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў саўгасе не арганізавана.

Саўгас праяўляе поўную бязьдзейнасьць у рамонце трактароў. Два трактары патрабуюць рамонту, але ў рамонт здалі толькі адзін, другі-ж на погляд дырэкцыі, хай пачакае, бо зараз трэба малаціць і рэзаць сечку для коняй.

Зараз у сувязі з падгатоўкай да раённага зьлёту калгасьнікаў ўдарнікаў разгорнута баявая работа па рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару. 39 плугоў і 58 барон адрамантаваны. І 13 акучнікаў адрамантавана 7 штук. Цягавай сілай саўгас забясьпечаны на 70 проц.

Саўгас павінен узяць баявыя тэмпы па вывазцы ўгнаеньня і поўнай заапцы насенных фондаў. Рапартаваць аб гэтай перамозе раённаму зьезду калгасьнікаў-ударнікаў—справа гонару трыкутніка і ўсяго рабочага калектыву саўгасу імя Лекерта.

ТУПІЦКІ П. А.

15 сакавіка—апошні тэрмін

Пасеўная плошча прыгарадной гаспадаркі шклозаводу «Кастрычнік» (Асіпавіцкі раён) у гэтым годзе павялічылася яшчэ на 20 га. Райспажсаюз абяцае дадаць яшчэ 31 га зямлі. У выніку прыгарадная гаспадарка павінна засеяць 74 га зямлі.

Для выкананьня гэтай баявой задачы неабходна вывезьці 2.000 вазоў угнаеньняў з якіх гною 1.500 вазоў і 200 вазоў попелу. На сёньнішні дзень вывезены ўвесь маючыйся гной у колькасьці 500 вазоў, астатні-ж мяркуецца купіць у пайнікаў.

У той час, як гаспадарка адчувае значныя недахопы ў насеньні, самаазгатоўкі апошняга праходзяць вельмі марудна з-за неафармленьня крэдыту.

Слаба забясьпечана гаспадарка цягавай сілай. Яна мае толькі 5 коней і на часовае карыстаньне ўзяла ў Белдзяржбуду 11 коняй.

Паказаныя факты сыгналізуюць аб тым, што веснавая сяўба ў прыгарадной гаспадаркі пад пагрозай зрыву. Заводзкія арганізацыі тэрмінова павінны пераключыцца на дапамогу гаспадарцы у вывазцы гною, рамонту інвэнтару і самазагатовак насеньня.

15 сакавіка — апошні тэрмін. Прыгарадная гаспадарка павінна сустрэць яго падгатоўленай.

А. ГАРЭЦКІ.

Тэрмін рамонту трактароў канчаецца праз 10 дзён

Трактарацэнтры і МТС абавязаны выканаць баявое заданьне

ЗВОДКА

ХОДУ РАМОНТУ ТРАКТАРОЎ ПА БССР на 3 сакавіка 1933 г.

Па БССР патрэбна адрамантаваць **2832** трактары, адрамантавана **1084**, што складае **38,1** проц.; прырост за дзень **0,5** проц.

Па Ленатрактарацэнтру

Патрэбна адрамантаваць **623** трактары, адрамантавана **259**, што складае **41,6** проц.

Дырэктар тав. ТКАЧУК

Да вызначанага тэрміну—15 сакавіка—застаецца ўсяго 10 дзён. Адзін, Лёна трактарацэнтр на чале з яго дырэктарам тав. Ткачуком не здолелі ўзяць такіх тэмпаў у рабоце каб забясьпечыць выкананьне рамонту да гэтага часу. Прырост за дзень складае ўсяго толькі 3 проц. Лічба яўна ганебная, лічба, якая сьведчыць аб тым, што кіраўніцтва Лёнатрактарацэнтру ня здольна сваячасова прывесьці ў баявую гатоўнасьць трактарны парк сваіх МТС.

Па Зернятрактарацэнтру

Неабходна адрамантаваць **342** адзінкі, адрамантавана **162**, процант выкананьня **47,7**

Дырэктар тав. ДУБОЎСКІ

Сёньняшняя зводка паказвае нават памяншэньне выкананьня пляну рамонту на 1,5 проц. Тры адрамантаваных трактароў пойдзе прапа і за ноч.

Факты няправільнай падачы Кастрычніку трактароў у зводках ходу рамонту неадзінавыя. Учора гэтае-ж самае было і ў зводцы Лёнатрактарацэнтру. Але Наркамзем, прыватнасьці сэктар вучоту ўпарта адмаўчваюцца і працягваюць даваць блыканыя зводкі.

Па гародна-бульбянаму трактарацэнтру

Плян рамонту— **508** трактароў, адрамантавана **230**, выкананьне **45,3** проц. да пляну.

Дырэктар тав. ГРАБЕНЧЫК

Прырост па рамонту ў МТС Гароднябульбянага Трактарацэнтру, за сёньнішні дзень складае ўсяго толькі 0,4 проц., за мінулыя два дні па 0,7 проц. і г. д.

Трактарацэнтр павінен напружыць усе свае сілы, ліквідаваць маючыяся недахопы, каб дабіцца сапраўднага пералому ў ходзе рамонту.

Перадавікі

МТС па рамонце трактараў

Буда-Кашалеўская: заданьне—21, адрамантавана—21.

Дырэктар тав. Жалезьнякоў.

Капыльская: заданьне—28, адрамантавана—27.

Дырэктар тав. Басалыга.

Дрысенская: заданьне—21, адрамантавана—20.

Дырэктар тав. Кляшчоў А. Е.

ЗАНОСЯЦЦА НА ЧОРНУЮ ДОШКУ

як ганебна зрываючыя плян рамонту трактароў

НАСТУПНЫЯ МТС:

Па сыстэме Ільнатрактарацэнтру

Бешанковічы—Дырэктар Агееў
Бялынічы „ Бендо
Гарадок „ Нікіфараў
Мсьціслаў „ Швэдзік
Шклоў Зелянкоўскі
Крупкі „ Бобрык

Па Бульбянаму Трактарацэнтру

Гомельская Дырэктар Байдакоў
Барысаўская „ Хоміч

НАСТУПНЫЯ МТМ:

Гомельская—Дырэктар Налевіч
Аршанская „ Штэер
Гарадоцкая „ Лялюга

Рамонт трактароў зрываецца

Па калгасах Петрыкаўскага раёну пырока разгорнута работа па рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару. Значная частка калгасаў ужо закончылі рамонт.

Аднак справа з рамонтам інвэнтару ПА САЎГАСАХ, асабліва трактароў стаіць дрэнна. У раёне ёсьць адна МТМ, якая абслугоўвае ўсе саўгасы (майстэрня пры саўгасе «Камарозічы»). Майстэрня не забясьпечана запасными часткамі для трактароў. Недахоп карэнных шарыкападшыпнікаў шасьцірон задніх, поршняў, ролікавых падшыпнікаў—пагражае зрывам рамонту трактароў па ўсяму раёну.

Белдзяржснаб, ня гледзячы на шматлікія патрабавань

Неадкладна праверыць—у чыіх руках калгасны конь

„Калі мы сур'ёзна змагаемся за павышэньне ўраджайнасьці, за павялічэньне даходнасьці нашых калгасаў, дык трэба цяпер-жа рыхтаваць каня да вясны“ (З адозвы усесаюзнага зьезду ударнікаў-калгасьнікаў)

Аб ходзе завозу кармоў для саўгасаў БССР

Пастанова Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне т. т. Сьмірнова, Сьцяпанава, Казака і Жукава аб прынятых імі мерах па забесьпячэньню саўгасаў БССР адпаведнымі кармамі, лічыць устаноўленым, што:

1. Кіраўніцтва Ўп. НКсаўгасаў БССР і тав. Сьмірноў зусім не займаліся справай арганізацыі атрыманьня па цэнтралізаваных нарадах адпушчаных для саўгасаў БССР кармоў, не арганізавалі штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва і кантролю за ходам завозу гэтых кармоў па назначэньню, спадзяючыся выключна на дырэктароў саўгастрэстаў, дапусьцішы поўны самацёк у этай справе, за што т. Сьмірнову паставіць на від.

2. Дырэктарам Менжывёлсаўгастрэсту тав. Сьцяпанаваым ня вызначан стары адказны працаўнік па ажыцьцяўленьню штодзённага кантролю за ходам і сваячасовай адгрузкай вызначаных кармоў па нарадах, у выніку чаго па 15-II з вызначаных па цэнтралізаваных нарадах завезена ў саўгасы, аб'яднаныя трэстам, 48 тон, што складае 11 проц. завозу, за што тав. Сьцяпанаву абвясьціць вымову.

3. Дырэктарам Віц. Жывёласаўгастрэсту тав. Казаком зусім ня былі пра інструктаваны пасланыя на Ўкраіну работнікі за атрыманьнем кармоў па цэнтралізаваных нарадах, з прычыны чаго ня былі здольны выканаць ускладзеных на іх даручэньняў (на працягу больш 20 дзён прабываньня на Ўкраіне—адгружана толькі 13 тон атрубей), за што тав Казаку абвясьціць вымову.

4. Дырэктарам Менсьвінсаўгастрэсту тав. Жукавым адпушчаныя па цэнтралізаваных нарадах Менскай канторай Саюзкрупы 31-I 1933 г. кармы ў колькасьці 179 тон—не атрыманы, ня гледзячы на неаднаразовыя паведамленьні Саюзкрупы, за што тав. Жукаву абвясьціць суровую вымову.

5. Прыняць да ведама паведамленьне тав. Сьмірнова, што ім зараз прыняты ўсе меры для поўнай рэалізацыі парадаў НК саўгасаў СССР па завозу кармоў па цэнтралізаваных нарадах у саўгасы БССР. Папярэдзіць тав. Сьмірнова і дырэктароў трэстаў, што калі імі ня будуць поўнасьцю завезены кармы па цэнтралізаваных нарадах у вызначаны СПА тэрмін, яны будуць прыцягнуты да больш суровага партыйнага спагнаньня.

6. Гэту пастанову апублікаваць у друку.

СТАРШЫНЯ ЦКК КП(б)Б
НАРКОМ РСІ БССР І. ЛЫЧОЎ.

Кулацкія агенты павінны атрымаць па заслугах

ДУБРОЎНА. Пастанова партыі і ўраду аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да вясны не знайшла свайго адбіцьця сярод зямельна-калгасных органаў раёну. Партыйныя ячэйкі, сельсаветы не разгарнулі вакол гэтай пастановы шырокай масавай работы. У многіх калгасах цягавая сіла знаходзіцца ў недапушчальным становішчы. Працезныя ў калгасы кулакі і іх агенты драпежна зьнішчаюць жывёлу. Так, у калгасе «Маяк пяцігодкі», Савінскага сельсавету, коні бяруцца ўсімі, каму толькі ўздумаецца, без дазволу праўленьня калгасу. Хамуты да коняй ня прытнаны, у выніку чаго ў коняй абмулены шыі. Кормяцца коні бяз усякай нормы і несваячасова.

У калгасе «Піцнэр» Нова-Тухінскага сельсавету, кулацкі агент Тарасёнак, пралезшы ў калгас старшынём, драпежна зьнішчае коняй. Коні ў калгасе поюцца атручанай сілой балотнай вадой, якая знаходзіцца на адтэгласьці двух кілёмэтраў ад калгасу, з прычыны чаго коні часта хварэюць.

Старшыня калгасу «Уперад», Кляноўскага сельсавету Малахаў разбазарвае лепшых коняй. Малахавым прададзены двое коняй у той час, калі калгас адчувае недахоп у цягавай сіле. Ня лепш справа стаіць з цягавай сілай у калгасах «Марак», «Чырвоная Слабада» і інш., але ні Райсавет, ні пракуратура ніякіх мер ня прымаюць да шкоднікаў.

Бальшавіцкі прыклад, як трэба падрыхтаваць каня да сяўбы, паказвае калгас «Чырвоны чырнец», Кляноўскага сельсавету. У калгасе ліквідавана на абязьлічка па догляду за коньмі, створана сталая брыгада, якая поўнасьцю адказвае за становішча цягавай сілы. Коні ў калгасе маюць добры выгляд, кормяцца сваячасова, а корм скарыстоўваецца рацыянальна. Калгас поўнасьцю стварыў кармавы фонд на час веснавой сяўбы.

БЕЛТА.

Коні Казлова—лепшыя ў калгасе

РАГАЧЭЎ. Добры, дужы конь выратае посьпех сяўбы,—так заяўляе КАЗЛОЎ ЦІМОХ, конюх калгасу імя СЬВЯРДЛОВА (Сьвяцкі сельсавет). Калгасьнік Казлоў свае словы ажыцьцяўляе на практыцы. Даручаныя яму 18 коняй ён даглядае дбайна і клапатліва. Казлоў своячасова корміць коняй, поіць іх сьвежай, чыстай і ня вельмі халоднай вадой. У хляве ў яго поўны парадак. Гной штодзённа раўняецца. Кожны дзень падсьцілае па сьвежая салома. Казлоў сочыць за тым, каб калгасьнікі ў часе работы не ганялі коняй, ня білі іх; ён глядзіць таксама сам за тым, каб калгасьнікі ня бралі коняй на непатрэбныя разъезды. Гэтыя добрасумленныя адносіны Казлова да сваіх абавязкаў далі свае вынікі. Коні, якія даглядаюцца Казловым, лепшыя ў калгасе. Яны ня змулены, не зьнясілены, заўсёды чыстыя, ухарчованыя.

Зусім іншы выгляд маюць коні конюха ЯРОМАВА Янкі—гэтага-ж калгасу. ЯРОМАЎ «даглядае» 16 коняй. Але гэты догляд выражаецца ў тым, што ён зьдзекуецца над коньмі. Калі ўздумаецца, тады ён іх і корміць, поіць іх раз у суткі. У стайні, дзе стаяць коні ЯРОМАВА,—беспарадак, груды гною, падсьціл мяняецца вельмі рэдка. Выгляд коняй самы нікудышны. Гультая ЯРОМАВА трэба прагнаць са стайні, а паставіць даглядчыкам коняй чалавека-ж ударніка, як і КАЗЛОЎ Цімох.

(БЕЛТА).

Апартуністы не сьпяшаюцца

Пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР «аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да веснавой сяўбы» па многіх калгасах ЧАЧЭРСКАГА раёну не распрацавана. Таму нядзіўна, што ў адным з буйнейшых калгасаў Нова-Загарачанскага сельсавету—ў калгасе «Камінтэрн» коні знаходзяцца ў вельмі дрэнным становішчы. Стаяць у адной стайні, станкоў няма, коні ня прывязваюцца, корм кідаецца пад ногі, у выніку чаго слабейшыя коні цэлыя дні стаяць ня еўшы. Збруя да коняй не падабрана і не прымацавана.

Калгас «Камінтэрн» адстае з падрыхтоўкай да сяўбы і па іншых галінах работы. Рамонт інвэнтару. праходзіць надзвычайна марудным тэмпамі. Парт'ячэйка і праўленьне калгасу з падрыхтоўкай не сьпяшаюцца.

ЧЫРВОНЫХ.

Раённы зьлёт конюхаў-ударнікаў

КЛІМАВІЧЫ. Скліканьне ўсесаюзнага зьлёту конюхаў знайшло шырокі водгук сярод калгасьнікаў раёну. Зараз па ўсіх сельсаветах раёну праводзяцца зьлёты конюхаў-ударнікаў.

5 сакавіка праводзіцца раённы зьлёт конюхаў-ударнікаў. Да зьлёту разгорнута шырокая падрыхтоўчая работа. Конюхі калгасу «Камунар Магілеўшчыны» абавязаліся як належыць падрыхтаваць каня да сяўбы, рацыянальна скарыстоўваць кармы, поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку ў доглядзе і т. д.

(БЕЛТА).

Не корм вінаваты

Рамонт інвэнтара па калгасе «Чырвоны партызан» (вёска Гатава) амаль што праведзен, не хапае толькі пары конных аднаконных вазоў ня гледзячы на тое, што калгас 5 месяцаў таму назад купіў 5 параконных вазоў у Белсельснабе, але апошні калгасу іх не перадае. Калгас на мае свайго рымара і гэта ставіць пад пагрозу зрыў рамонту вупражы.

А вось коні па аддзяленьні калгасу «Чырвоны Партызан» (вёска Аўсееўка) ў ганебным стане, яны ўжо зараз ня могуць падняцца. Кіраўнікі калгасу матывуюць гэты факт дрэннай якасьцю кармоў, але гэта ўсё-ж ня так, з боку кіраўніцтва калгасу ня было ўвагі бясьпечаны штодзённы догляд за коньмі, корм направільна разьмяркоўваўся паміж Гатаўскім і Аўсееўскім аддзяленьнямі калгасу.

Сельскія арганізацыі павінны прыняць усе захады, каб цягавую сілу добра падрыхтаваць да выхаду ў поле.

Брыгада «Сав. Бел.»
Кадышоў, Шамес
Гельфанд і Пэўзнэр

Памольны збор разбазарваецца

ЕЛЬСК. (Ад наш. кар.) Памольны збор—неадрыўная частка збожжазагатовак. Але ельскія загатоўчыя, савецкія і партыйныя арганізацыі, выканаўшы збожжазагатоўкі, не зьвяртаюць ніякай увагі на выкананьне плянаў памольнага збору. Ельская Райкантора «Загатзёрне» студзеньскі плян памольнага збору выканала на 33 проц., здаўшы дзяржаве толькі 13,5 тон.

Такая ганебная лічба ў выкананьні не зрабіла ніякага ўплыву як на загатоўчыя, так і на партыйныя і савецкія арганізацыі раёну. Замест таго, каб выправіць дапушчаныя ў студзені памылкі і разгарнуць работу з такім разьлікам, каб нагнаць упушчанае ў лютым, раённыя работнікі павялі справу, так, што на 18 лютага сабрана ўсяго 10 тон ці 6 проц. да пляну.

Чаму гэта так здарылася? Дзе хаваюцца прычыны ганебнага прарыву? Хіба пляны былі не рэальны? Не, пляны былі рэальны, але загатоўчыя арганізацыі зусім бязьдзейнічаюць. Іх бязьдзейнасьць, мяжуе са шкодніцтвам. Адсутнічала барацьба з кулацкім сабатажам і іх агентамі з партбілетамі ў кішэні. Дамо слова фактам.

У Каменскім сельсавеце на млыне ерудуе сваяк высланага кулака—Урсень Віктар. Увесь памольны збор, звыш тоны (жыта, грэчка, і авёс), ён разбазарыў, прапіў сумесна з «дзельцамі» з калгасу «Камінтэрн».

Хто такі Мішчанка?

Мішчанка—член партыі, нядаўна быў зьняты з работы старшыні калгасу імя Леніна за сувязь з кулакамі і развал калгасу. А сёньня ён арудуе гаспадарнічае на крупадзёрцы, у калгасе «Шырокая Ніва».

У Стара - Высоцкім сельсавеце загадчык млына Коркуць Стась на працягу ўсяго 1932 і студзеня месяца 1933 г. ня браў памольнага збору з калгасу «Прыклад» (З гэтага калгасу належала паступіць 855 клгр. памольнага збору). А колькі яшчэ не спагнана памольнага збору з яго знаёмых і сваякоў?

Усе гэтыя злачынныя дзеяньні кляпа-варожых элемэнтаў застаюцца непакаранымі. Раённая загатоўчая і грамадзкія арганізацыі не зьвяртаюць на гэта ніякай увагі.

ГЕРАСІМЕНКА.

Аздаравіць саўгас „Новы сьвет“

Апартуністы, шкоднікі развальваюць саўгас. Дзе былі арганізацыі зав. „Камунар“ і Белкаапсаюз? Чаму маўчыць гарсавет і гарпрафсавет?

У 1930 годзе на тэрыторыі ўсебела рускай сельска-гаспадарчай выстаўкі, на плошчы 250 га арганізавалася прыгарадная гаспадарка—саўгас «НОВЫ СЬВЕТ». Тры гады—тэрмін вялікі; шмат вады за гэты час уцякло ў Сьвіслач, усьлед за вадою шмат чаго ўцякло і з саўгасу за гэты час. Саўгас пасьпеў пабываць у веданьні МЦРК, Белкаапсаюзу, ЗРК мэталістаў, зараз саўгас знаходзіцца ў веданьні ЗРК заводу «Камунар».

Краіна саветаў знаходзіцца ў палае разгорнутай падрыхтоўкі да першай вясны другой пяцігодкі. Перад партыйнымі, савецкімі, гаспадарчымі прафсаюзнымі арганізацыямі стаяць грандыёзьнейшыя задачы ў справе падрыхтоўкі да правядзеньня гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі, да ашчэ большага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня саўгасаў і калгасаў.

Як-жа рыхтуецца да вясны саўгас «Новы сьвет»?

Калі наша брыгада вышла з канторы саўгасу і накіравалася ў канюшню, дык загадчык гаспадаркі тав. МАРУК памахаў нам усьлед рукой і, ні быццам радуючыся, крыкнуў: «Вось там вы знойдзеце сапраўдныя агіднасьці».

Агіднасьцяй, і самых сапраўдных, шмат ня толькі на канюшні; дзейнасьць усяго саўгасу ў цэлым—суцэльны клубок агіднасьцяй.

Партыя і ўрад далі зусім ясную і катэгарычную дырэктыву АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ РАБОЧАЙ ЖЫВЁЛЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ. Як-жа абстаіць справа з цягавай конскай сілай у саўгасе «Новы сьвет»?

Яшчэ ў студзені месяцы г. г. у саўгасе мелася 28 коняй, зараз іх засталося толькі 26, два з іх палі, ас гатнія знаходзяцца ў вельмі дрэнным становішчы. Усе яны амаль напалову згубілі сваю працаздольнасьць. Вось перад намі зусім сьвежы акт камісіі, якая правярала становішча конскай цягавай сілы саўгасу. Камісія ў сваім акце адзначае што «КАБЫЛА 8 ГОД ЗАРАЗ МАЕ ТОЛЬКІ 20 ПРОЦ. ПРАЦАЗДОЛЬНАСЬЦІ, ДРУГАЯ КАБЫЛА 9 ГОД—30 ПРОЦ., 3-я КАБЫЛА 4½ ГАДЫ—30 ПРОЦ., КОНЬ БУРЫ—30 ПРОЦ., ВАРАНЫ КОНЬ — 30 ПРОЦ.» і г. д. У такім становішчы знаходзіцца амаль увесь конскі склад саўгасу «Новы сьвет».

Кіраўніцтва калгасу такое становішча імкнецца апраўдаць аб'ектыўнымі прычынамі: «Няма кармоў». І сапраўды так. Кармоў няма. Што-ж рабіла кіраўніцтва саўгасу для таго, каб забясьпечыць поўнасьцю і сваячасова цягавую сілу кармамі?.. Нічога. Вось прыклад. Саўгас накасіў у Жытковіцкім раёне 100 тон сена, аднак, прывезьці гэтае сена і да гэтага часу не паклапаціліся, і там неадлучна ся дзяць два чалавекі.

Па пляну трэба было засіласаваць 420 тон кармоў, тым часам засіласавалі толькі 150 тон. Такім чынам, на сёньняшні дзень саўгас апынуўся перад такім фактам, што няма ніводнага кг сена, ня больш як на тыдзень хопіць сілосу. На запытаньне брыгады, што мяркуе рабіць саўгас, атрымліваецца адказ: «ня ведаем».

Як-жа падрыхтаваны саўгас у сэнсе забесьпячэньня насеньнем на час веснавой сяўбы? Не хапае 6,5 тон аўса, 43,5 тон бульбы. Трэба пасеяць 7,5 тон вікі, але не зусім няма, не хапае 300 тон славэчніка. 660 кілёграм сэрадэлі.

Ня лепш стаіць справа і з угнаеньнем, Па пляну трэба вывезьці 5041 тону гною, вывезена-ж толькі 1407 тон. Мінэральнага ўгнаеньня трэба 79 тон, а ёсьць толькі 32 тоны. Пытаньнем збору попелу кіраўніцтва саўгасу зусім не займалася. Заданьне было сабраць 111 тон, але яго зусім ня ма.

Дрэнна праходзіць рамонт с.-г. інвэнтару. Саўгас мае 17 калёс, але з іх адрамантавана толькі 6.

Кіраўніцтва саўгасу нават і ня думала яшчэ заключыць дагавор з МТС на час веснавой сяўбы, матывуючы гэта тым, што ім «няма магчымасьці» апрацоўваць зямлю трактарамі (?)



Яшчэ ў часе ўборачнай кампаніі саўгас меў вялікі прарыў. На полі засталося няўбранымі 15 га аўса, 3 га бураку. Гэта вынік толькі таго, што ў саўгасе адсутнічае жывое апэрацыйнае кіраўніцтва з боку трохкутніка.

Ня лепш стаіць справа з забесьпячэньнем рабочых. У саўгасе налічваецца 90 рабочых, аднак рабочыя дрэнна забясьпечваюцца харчаваньнем. Кіраўніцтва саўгасу не паклапацілася аб забясьпечаньні рабочых дрывамі. Ужо тры месяцы, як рабочыя не атрымліваюць зарплаты, у саўгасе вялікая цякучасьць рабочай сілы. Арганізаваным наборам рабочай сілы саўгас не займаецца. САЎГАС ЗАСЬМЕЧАН ВАРОЖЫМ, КЛЯСАВА-ЧУЖЫМ ЭЛЕМЭНТАМ. Вось прыклад, у саўгасе папалі выселеныя кулакі ФАЛЬКОЎСКІ І ВАЛОДЗЬКА. Першы з іх займаў пасаду санітара, другі рымара. І зусім невыпадкова, што коні саўгасу апынуліся ў такім становішчы.

Дырэктар саўгасу СОКАЛАЎ амаль ня бывае ў саўгасе; ён увесь час знаходзіцца няма ведама дзе. Тое самае трэба сказаць і адносна партыйнай прафсаюзнай арганізацый. Работу рабкома досыць яркa характарызуе поўная адсутнасьць самапаборніцтва і ўдарніцтва. Не заключаны паміж рабочымі сацумовы. Але затое ёсьць сацумова паміж канторай і сталоўкай, у якой гаворыцца, што адміністрацыя бярэ на сябе абавязкі «ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ КАНТОРУ САЎГАСУ АПАЛАМ І СЬВЕТАМ, ПАСТАВІЦЬ ДРУГІЯ РАМЫ, ЗРАБІЦЬ ФОРТАЧКУ, АГЛЕДЗЕЦЬ ДЗЬВЕРЫ КАНТОРЫ, АКЛЕІЦЬ СЬЦЕНЫ І ПАТАЛОК, НАБЫЦЬ ДЛЯ ВАДЫ ГРАФІН АБО ВЯДРО». Вось умова, якая характарызуе работу трохкутніка па разгортаньню сацпаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочых саўгасу. па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні яго, па падрыхтоўцы вялікіх задач, якія стаяць перад саўгасам у часе першай вясны другой пяцігодкі.

Зараз партыйная ячэйка саўгасу, у сувязі з пераходам яго ў веданьне заводу «Камунар» аб'ядналася з камунарскай ячэйкай. Трэба было чакаць, што з боку партыйнай ячэйкі з-ду «Камунар», з боку заўкома будзе належнае кіраўніцтва саўгасам. Аднак, гэтага кіраўніцтва з боку партыйнай ячэйкі заводу «Камунар» і заўкому зусім няма. Сакратар партыйнага калектыву, старшыня заўкому яшчэ ні разу ня былі на тэрыторыі саўгасу, ня цікавіліся тым цяжкім становішчам, у якім знаходзіцца саўгас. У саўгасе часта бываюць розныя брыгады гарсавету, гарпрафсавету, аднак гэтыя брыгады нічога не зрабілі для таго, каб палепшыць работу саўгасу, каб вывесьці яго з той паласы прарыву, у якім ён знаходзіцца.

Нельга ніяк абыйсьці моўчкі міма таго факту, што ў саўгасе ЗУСІМ АДСУТНІЧАЕ КРЫТЫКА І САМАКРЫТЫКА. Няма насьценных газэт. Рабочыя баяцца крытыкаваць адміністрацыю, партыйнае і прафсаюзнае кіраўніцтва. На паперы ёсьць і рэдкалегія, але яна сьпіць непрабудным сном. Ня выпушчана ніводнага нумару насьценгазэты і зусім ня дзіўна, што аграном ІЗРАІЛЕВІЧ шопатам расказваў брыгадзе аб усіх агіднасьцях, якія маюць месца ў саўгасе, ён баяўся, каб аб гэтым хто небудзь не даведаўся.

У саўгасе «Новы сьвет» тры ненадзейныя куты; за які з іх ні вазьміся, ніводны ня здольны кіраваць саўгасам. Шкоднікі, апартуністы зьвілі сабе цёплае гняздо ў саўгасе.

МЫ ПАТРАБУЕМ АД АДПАВЕДНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ НЕАДКЛАДНАГА ЎМЯШАНЬНЯ Ў СПРАВУ САЎГАСУ «НОВЫ СЬВЕТ», НЕАДКЛАДНАЙ АЧЫСТКІ ЯГО АД БАРОЖА-ЧУЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ, НЕАДКЛАДНАЙ ЗЬМЕНЫ КІРАЎНІЦТВА, ЯКОЕ ПЕРАРАДЗІЛАСЯ, ЯКОЕ НЯ ЗДОЛЬНА КІРАВАЦЬ.

Трэба ў бліжэйшыя дні зрабіць ад паведныя арганізацыйныя вывады, ад даць пад суд усіх тых, хто да сёньня няга дню тварыў сваю агідную справу, прывёў саўгас да вялікіх прараваў.

Брыгада газэты «Савецкая Беларусь»: МАРКАЎ, КАГАН, КАВАЛЁЎ, КУЛЯШОЎ І МЯДЗЬВЕДЗЕЎ.

На Гомельскім вузьле прастойваюць пасеўныя грузы

Ніводнай лішняй хвіліны не павінны прастойваць вагоны з пасеўнымі грузамі. Гэта вядома і зразумела кожнаму чыгуначніку. Гэтага-ж патрабуе і загад наркому шляхоў зносін тав. Андрэева.

Аднак, у практыцы Гомельскага вузлу мы маем такія факты, калі транзітныя вагоны, (якім наогул нельга прастойваць на вузьле больш 9 гадзін), з пасеўнымі грузамі прастойваюць значна больш вызначанага тэрміну. Так, 20 лютага 14 вагонаў з пасеўнымі грузамі прастаялі на вузьле па 10 гадзін 45 хвілін з прычыны таго, што манэўровы дыспэтчар ШЫЛАК, не даў загаду адправіць іх з адышоўшым раней цягнікам. Маюць месца і акія моманты, калі вагоны з пасеўнымі грузамі не адпраўляюцца з простымі цягнікамі, а прастойваюць у чаканьні прычэпкі іх да зборных цягнікоў. Так, у гэты-ж дзень 20 лютага два вагоны прастаялі па 11 гадзін 45 хвілін і два вагоны па 19 г. 15 хвілін.

Акрамя таго, нярэдкі выпадкі, калі вагоны з пасеўнымі грузамі з прычыны нераспарадчасьці манэўровага дыспэтчара адпраўляюцца са спазьненьнем, а потым прастойваюць яшчэ суткі на Калінкавіцкім і Васілевіцкім вузлах, бо цягнікі там на Жыткавічы і Хойнікі, ходзяць толькі адзін раз у суткі.

Такім чынам прастоі вагонаў з пасеўнымі грузамі зьяўляюцца выключна вынікам нераспарадчасьці саміх работнікаў станцыі, абавязаных змагацца за хутчэйшае прасоўваньне гэтых грузаў.

У значнай меры гэта зьяўляецца і вынікам адсутнасьці дастатковага кіраўніцтва і сваячасовага рэагаваньня з боку начальніка вузлу. ГАРДЫНЦА. Нават дыспэтчарская нарада станцыі, якая павінна плянаваць рух пасеўнага грузу, не зьбіраецца Гардынцом па тры дні.

Лепш за ўсіх аб адносінах да прасоўваньня пасеўных грузаў расказаў дыспэтчар МАЛІНЕЦКІ. Ён заявіў—«пакуль не прыпяяюць, займацца хутчэйшым прасоўваньнем пасеўных грузаў, ня варта». Яго думка гэта думка шмат каго з работнікаў Гомельскага вузлу і яна падцьвярджаецца фактамі значных прастояў вагонаў з пасеўнымі грузамі. Работнікі Гомельскага вузла не мабілізаваны вакол барацьбы на хутчэйшае прасоўваньне пасеўных грузаў.

Нельга тут не падкрэсьліць і віны мясцкому, які не арганізаваў сапраўды апэрацыйных кантрольных пастоў, якія-б адразу на месцы рэагавалі на агідныя факты ператрымак вагонаў з пасеўнымі грузамі. Да арганізацыі гэтых пастоў мясцком аднёсься фармальна, у выніку чаго арганізаваныя кантрольныя пасты зусім не працаздольны.

Не мабілізаваны вакол гэтай справы і дэпутаты гарсавету. У прыватнасьці ў мясцкоме дэпутатская група не арганізавана. Старшыня мясцкому ВЕНГЛІНСКІ гаворыць, што ў яго былі чатыры разы прадстаўнікі гарсавету і кожны раз прыходзіў новы чалавек. Усе яны гаварылі аб неабходнасьці арганізацыі дэпутацкай групы, але пагутарыўшы ўхадзілі і усё заставалася па-старому. Колькі ў мясцкоме дэпутатаў гарсавету, Венглінскі дакладна ня ведае. Гаворыць, здаецца больш пяці. Ня ведае ён так сама і як іх арганізаваць у групу і якую работу праводзіць з імі.

Усе гэтыя факты гавораць за тое, што калі зараз жа ня будзе перабудавана работа зьнізу і да верху, калі людзі ня будуць адчуваць адказнасьці за выконваемую імі работу, Гомельскі вузел ня будзе здолен змагацца за хутчэйшае прасоўваньне гэтых грузаў. Яны па ранейшаму будуць значна перапрастойваць і ўхадзіць з вузлу неарганізаванымі маршрутамі і не першымі-ж цягнікамі, а самацёкам са зборнымі цягнікамі.

Л. СОЛІМОВІЧ.

Засыпаюць неачышчанае насеньне

РАГАЧЭЎ. Плян стварэньня насенных фондаў па калгасах Рагачэўскага раёну выканан на 95,8 проц. Ачыстка насеньня па калгасах раёну праведзена—па збожжавых культурах на 65 проц. і тэхнічных толькі на 43 проц., а па аднаасобным сэктары: па збожжавых—толькі на 11 проц. і тэхнічных—на 9 проц. Як бачым, становішча з ачысткай насеньня па раёну пагражаючае. Толькі калгасы Гарадзецкага сельсавету поўнасьцю скончылі ачыстку насеньня.

У радзе калгасаў Вішанскага, Курганскага, Прыбарскага, Званецкага, Стаўпянскага, Мадорскага і інш. сельсаветаў раёну фармальна падыходзяць да справы засыпкі насеньня, ніводнага кілё не ачышчана, а справу лічаць скончанай.

Закараналась апартуністычнай благадушнасьці райза і адзначаных сельсаветаў у справе ачысткі насеньня павінна быць зараз-жа разбіта.

Да пачатку сяўбы асталося зусім мала часу. Гэты тэрмін павінен быць максымальна выкарыстан для таго, каб поўнасьцю засыпаць і ачысьціць насеньне.

Райза, МТС, партыйэйкі, сельсаветы і праўленьні калгасаў шчыльна ўвязваючы работу па засыпцы і ачыстцы насеньня з работай па падрыхтоўцы ўсіх участкаў да веснавой сяўбы, павінны безадкладна забясьпечыць пасеўную плошчу адпаведнай колькасьцю ачышчанага насеньня.

Ул. Паскрэпка.
А. Саманчук.



НА ЗДЫМКУ: Электра-плаўная печ рамонтна - мэханічнага цэху ў час плаўкі сталі.

Дэпутацкая група—ударная брыгада падрыхтоўкі да сяўбы

Дэпутацкая група калгасу «Герой Працы», Амельянаўскага сельсавету, у выніку праграпоўкі пастаноў партыі і ўраду, а таксама ў адказ на адозву зьезду калгасьнікаў - ударнікаў абвясьціла сябе мабілізаванай на пасьпяховае правядзеньне пасеўнай кампаніі. Калгасьнікі і члены дэпутацкай групы ШЫМАНКОВІЧ СЯМЕН, САРОКА ПАВЕЛ, ШЫМАНКОВІЧ СЬЦЯПАН, КАРАЛЁНАК, ШЫМАНКОВІЧ УЛАДЗІМЕР абвясьцілі сабе ўдарнікамі бальшавіцкай сяўбы першага году другой пяцігодкі, узяўшы на сябе канкрэтныя абавязацельствы.

Ударнікі - калгасьнікі арганізавалі ў калгасе пост газэты «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ». Сельпасеўком занёс на чырвоную дошку гэтую дэпутацкую групу за бальшавіцкія тэмпы ў падрыхтоўцы да сяўбы, за поўную ссыпку насенных фондаў, іх ачыстку, рамонт інвэнтару і добры догляд цягавай сілы

Зайцаў В.

Шкоднікі зьнішчаюць коняй

ГАСПАДАРКА ЖЛОБІНСКАГА РАЙ-ТСТ ПАТРАБУЕ РАШУЧАЙ АЧЫСТКІ

(Ад нашага жлобінскага карэспандэнта)

Надзвычайна вялікая і адказная задача стаіць перад прыгараднай гаспадаркай Жлобінскай РайТСТ у надыходзячую вясну. 431 га павінны быць засеяны ў максымальна-кароткія тэрміны; з гэтага ліку 323 га трэба засеяць гароднінай і бульбай.

Ад пасьпяховага правядзеньня сяўбы залежыць палепшаньне забесьпячэньня рабочых Жлобінскага вузла.

Але трэба з усёй катэгарычнасьцю адзначыць, што падрыхтоўка да сяўбы па прыгараднай гаспадарцы праваўваецца, што ставіць пад яўную пагрозу і самую сяўбу. Да такога становішча прывяло ігнараваньне кіраўнікамі прыгараднай гаспадаркі важнейшых дырэктыў партыі і ўраду і адсутнасьць увагі з фармальна - бюракратычнае кіраўніцтва гаспадаркай з боку праўленьня РайТСТ, райпрафсавета, партарганізатара, райвы і гарсавету.

Усе коні прыведзены ў нягоднасьць

Рашаючым пытаньнем у справе правядзеньня сяўбы зьяўляецца падрыхтоўка конскага пагалоўя. Але цяжка нават уявіць сябе бесчалавечныя, дрэнжыцкія адносіны да каня, якія існуюць на прыгараднай гаспадарцы Жлобінскага РТСТ.

Усяго тут ёсьць 53 коні і ні адзін з іх фактычна зараз ня можа працаваць. Амаль усе коні паабразаны да нематчымасьці, канчаткова замучаны.

«Няма канцэнтраваных кармоў, коні худыя, таму збруя паабразала іх плячы і сьпіны»,—спрабуюць «вытлумачыць» такое становішча кіраўнікі гаспадаркі.

Канцэнтраваных кармоў сапраўды няма. У іх набыцьці ня хоча аказваць дапамогі праўленьне РайТСТ. Але-ж аднойны вінавайца драпежніцкага зьнішчэньня конскага пагалоўя—дырэктар кія адносіны да каня.

«Рабочыя» ГРАДЗІЦКІ. ПАНАМАРОЎ. ДЗЯНІСЕНКА гоняць і б'юць коняй да таго, пакуль яны не падаюць; конюх—выпадкова папаўшыя на гаспадарку, нявыяўленыя нікім асобы; групі яўных шкоднікаў на чале з брыгадзірам КАРНЕЕВЫМ і б. сакратаром ячэйкі КСМ ЧАРНЯЦОВЫМ (сынам высланага кулака). разьязджаючы пэўлым днямі па гораду, б'юць коней. Фармальна коні як быццам прымацаваны да рабочых, абязьлічка ні бы ліквідавана, але 16 коняй пакідаецца ў «рэзэрве», імі карыстаецца, хто толькі жадае, і гэтыя коні даведзены да поўнай няпрыгоднасьці.

Рымар БЕРАСЬНЕЎ яўна па-шкодніцку рамантуе збрую, убівае ў клешчы хамута цьвікі, прыладжвае лямец так, што за першы-ж дзень конь абразаецца. І найбольш абураюча тое, што гэтае шкодніцтва нікога нават ня дзівіць, ніхто на гэта ня зьвяртае ўвагі. Апошнія выразныя дырэктывы партыі аб падрыхтоўцы конскага пагалоўя да веснавой сяўбы зусім не закранулі ўвагі грамадзкасьці прыгараднай гаспадаркі. Яўнае шкодніцтва конюхаў, рымара, кулакоў і падкулачнікаў, якія пры крываюцца маскай «рабочых» і нават «кіраўнікоў», праходзіць незаўважаным. Гаспадарка фактычна астаецца без цягавай сілы. Адсюль вынікі: замест 16000 вазоў гною, вывезена толькі 3.000 вазоў, замест 500 вазоў гною ў дзень, вывозіцца з вялікімі цяжкасьцямі толькі 50 вазоў.

„Насеньне яшчэ на Паўночным Каўказе“

Насеньнем для сяўбы гаспадарка не забясьпечана. Не хапае насеньня капусты, моркві, тамату, цыбулі, часнаку, пятрушкі, бабовых, бульбы, вікі, канюшыны і грэчкі. Гэта насеньне, паводле слоў кіраўнікоў гаспадаркі даўно закуплена на Паўночным Каўказе, але да гэтага часу ня прывезена.

Збор попелу правальваецца: замест 30 тон сабрана толькі 8 тон. Мінэраль нага ўгнаеньня завезена замест 78 тон толькі 16,5.

Зусім зразумела, што пры такой забясьпечанасьці угнаеньнем, пры пагражаючым становішчы з вывазкай гною, разважаньні аб барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці астаюцца пустымі словамі.

Парніковая кампанія пад пагрозай поўнага правалу. Трэба па пляну за класьці 1500 рам, закладзена 62. На 1000 рам не хапае матар'ялу, на набыцьцё апошняга няма ніякіх сродкаў.

Аграномы сядзяць у габінэце

Два аграномы ёсьць на прыгараднай гаспадарцы: тэх. дырэктар тав. ЯЗЕРСКІ і аграном па гароднінству тав. ЖАБІК. Справай барацьбы за ўраджай аграномы кіруюць з габінэту.

Арганізацыяй працы, расстаноўкай сілы аграномы не займаюцца. Па «цьвёрдай думцы» агранома ЯЗЕРСКАГА сталых вытворчых брыгад у гаспадарцы наогул нельга арганізаваць, вытворчых вучасткаў да іх нельга таксама без цягавай сілы. Адсюль вынікі: замест 16000 вазоў гною, вывезена толькі 3.000 вазоў, замест 500 вазоў гною ў дзень, вывозіцца з вялікімі цяжкасьцямі толькі 50 вазоў.

Агразоовучоба не арганізавана.

Тэрміны сяўбы вытворчым плянам устаноўлены «з магчымасьцяй гаспадаркі», тут сяўбу думаюць пра весьці за... 26 дзён (не ўключаючы гароднія культуры).

Хапаюцца за галовы...

Ні аб якой плянавай перабоўцы работы сілы тут і ня думаюць. Усяго ёсьць 133 рабочых, патрэбна-ж зараз 165, а з пачаткам сяўбы 250 чалавек. Рабочыя прыходзяць самацёкам. Прыходзяць зусім выпадковыя людзі, клясава-варожыя элемэнты. Кіраўнікі гаспадаркі ня ведаюць клясавага твару прыпоўшых да іх людзей, ня вывучаюць іх і толькі пры выпадках яўнага шкодніцтва і разбурэньня гаспадаркі хапаюцца за галовы і аддаюць загады аб іх звальненьні.

Загадчыкам сьвінаадкормачнага пункту тут

Крывавы тэрор фашыстаў не затрымае рэвалюцыйнага руху ў Германіі

Шырокія масы працоўных даюць адпор гітлераўскім пагромшчыкам

Шалёны тэрор супроць кампартыі Германіі

Арышт т. Тэльмана

БЭРЛІН. 3. Агенцтва Вольфа паведамляе: «Дэпутат рэйхстагу і сакратар Цэнтральнага Камітэту германскай кампартыі ЭРНСТ ТЭЛЬМАН сёньня днём арыштаваны ў памяшканні токара Кучынскага на Лютцэвэр штрасе ў Шарлётэнбургу (раён Берліна), дзе ён хаваўся.

Масавыя арышты камуністычных актывістаў

БЭРЛІН. 3-III. Агенцтва «Вольф» паведамляе, што ўчора ў Гамбурзе паліцыя, на аснове надзвычайнага дэкрэту, арыштавала 120 камуністычных актывістаў. Учора-ж ў Штутгарце паліцыя правяла вобыскі ва ўсіх памяшканьнях кампартыі, прычым ацэцам знайшла вялікую колькасьць матар'ялаў. Некалькі камуністаў арыштаваны за пашырэньне адозваў. У Гельборне паліцыя арыштавала 40 камуністаў актывістаў. У Эрфурце паліцыя закрыла памяшканьне мясцовых арганізацый кампартыі, рэвалюцыйнай арганізацыі, МОПР'у і міжнароднага саюзу ахвяр вайны.

Учора ў гарадох Усходняй Прусіі—Глевіцы, Гіндэнбурзе і Вэйдэне,—паліцыя арыштавала звыш 200 камуністычных актывістаў. У Швэйдэміле праведзены масавыя вобыскі і арышты камуністычных актывістаў. У Дрэзьдзене паліцыя правяла вобыск у памяшканьні камфракцыі Саксонскага лянтагу, прычым канфіскавана, быццам, многа матар'ялу. Масавыя вобыскі праведзены ў Рэгенсбурзе і Нюрэнбэрзе. Як паведамляе паліцыя, у Нюрэнбэрзе, у выніку вобыскаў, канфіскавана, быццам, звыш 20 цнт. камуністычных адозваў і быццам, выкрыта нелегальная камуністычная друкарня. У сувязі з гэтым арыштаваны тры камуністы. Масавыя вобыскі ў камуністаў праведзены ў Штэцціне. Шмат камуністаў арыштавана.

***

БЭРЛІН. 3-III. За ўчарашні дзень, як паведамляе агенцтва «Вольф», у БЭРЛІНЕ арыштавана 140 чалавек, «галоўным чынам, за заклік да гвалтаў або да забастоўкі, за пашырэньне забароненых выданьняў, за недазволены збор грошаў на карысьць кампартыі і за пашэньне зброі». Сьледчы бэрлінскага паліцэйпрэзыдыума пачаў супроць 20 арыштаваных справу па абвінавачваньні ў «дзяржаўнай здрадзе».

У Нюрэнбэрзе паліцыяй, быццам, выкрыта нелегальная друкарня, у якой канфіскавана вялікая колькасьць лістовак. У Браўншвэйзе праведзены вобыскі ў 63 членаў кампартыі. Камэнтуючы гэтае паведамленьне, агенцтва Вольф указвае: «характэрным зьяўляецца той факт, што ўсе мясцовыя актывісты кампартыі, у тым ліку ўсе члены мясцовага лянтагу, ужо шмат дзён не знаходзяцца на сваіх кватэрах». У Кенігсбэрзе паліцыяй арыштавана 40 актывістаў кампартыі.

У Брэслаўлі паліцыя правяла вобыск у доме рэфармісцкіх прафсаюзаў. Канфіскавана вялікая колькасьць друкаванага матар'ялу. Сход «жалезнага фронту», на якім павінен быў выступіць былы старшыня рэйхстагу Лебэ, забаронен.

Перадвыбарныя плякаты кампартыі заклеены

БЭРЛІН. 3-III. У Гамбурзе за апошнія два дні паліцыя правяла вобыскі ў кватэрах вядомых дзеячоў кампартыі і блізкіх да яе арганізацый. Усяго вобыскаў было зроблена больш чым у 50 кватэрах. Паводле афіцыйнага паведамленьня, пры вобысках знойдзена некалькі экзэмпляраў адозваў і брашур. У Шпэмеры праведзены вобыскі ў кватэрах камуністычных актывістаў. Камуністычныя перадвыбарныя плякаты заклеены па загаду паліцыі паперай. У Кельне арыштавана 60, у акрузе Зігіна—58 актывістаў кампартыі. У Кіле арыштавана 25 камуністаў.

Рэпрэсіі супроць друку

БЭРЛІН. 4. Обэр-прэзыдэнт Усходняй Прусіі забараніў польскую газэту «ГАЗЭТА ОЛЬСШТЫНСКА», якая выходзіць у Аленштэйне тэрмінам на два тыдні. Забаронена часопісь «Мазур», якая выходзіць у Ортэльзбургу тэрмінам на 4 тыдні. У Лебаў забаронена штодзённая газэта «ФАЛЬКС ЦЭЙТУНГ ФЮР ДЭ ОБЭРЛАЎЗІЦ» тэрмінам на два тыдні. У Брэслаўлі апячатаны машыны ў друкарні сацыял-дэмакратычнай газэты «ФОЛЬКС ВАХТ». У Трырэ забаронена на адзін дзень «ТРЫШЭ ЛЯНДЭС ЦЭЙТУНГ» за зьмяшчэньне артыкулу, у якім нацыянал-сацыялістская партыя, нібыта асьвятлялася ў ня дзелавым выглядзе». У Гамбургу канфіскован экстраны выпуск сацыял-дэмакратычнай газэты «ГАМБУРГЕР ЭХО».

Мабілізацыя дапаможнай паліцыі

БЭРЛІН. 3-III. Па ўсёй Германіі праводзіцца мабілізацыя так званай дапаможнай паліцыі. У раёне Бэргаўзэн-Мюльгейм (Рурская вобласьць) да гэтага часу мабілізавана 400 чал. з нацыянал-сацыялісцкіх штурмавікоў і членаў «Стальнога шлема». У Потсдаме ў атрады дапаможнай паліцыі мабілізавана 105 чал.—70 нацыянал-сацыялістаў і 35 членаў «Стальнога шлёма». Саксонскі ўрад таксама пастанавіў стварыць дапаможную паліцыю ў колькасьці 1500 чал.

У цыркуляры прускага міністэрства ўнутраных спраў гаворыцца, што членамі гэтай паліцыі могуць быць мужчыны ва ўзросьце паміж 21 і 45 гадамі прычым у яе пакуль, што могуць прымацца толькі члены нацыянал-сацыялісцкіх штурмовых атрадаў «Стальнога шлема» і ваенай арганізацыі партыі «Дойчэ нацыяналес-камфрынг». Колькасьць дапаможнай паліцыі не павінна перавышаць колькасьці звычайных паліцэйскіх кантынгентаў.

Абурэньне супроць фашысцкага тэрору расьце

БЭРЛІН. 4-III. Абурэньне супроць фашысцкага тэрору, якое нарастае ў шырокіх масах, стала прарывацца ў форме актыўнага адпору нападу. У Коблецы, пры арыштах камуністаў, вялікая колькасьць рабочых, запоўніўшы суседнія з памяшканьнем паліцыі вуліцы, прабавалі ўварвацца ў памяшканьне паліцыі з мэтаю вызваленьня арыштаваных.

Як паведамляе друк, у часе дэманстрацыі нацыянал-сацыялісцкія штурмавікі напалі на рабочых, прычым адбылася перастрэлка. Колькасьць раненых рабочых невядома, бо антыфашысцкія рабочыя зараз-жа забіралі свае ахвяры, каб не аддаваць іх у рукі паліцыі. Штурмавікоў ранена 10, забіт адзін. Выбухнулі антыфашысцкія дэманстрацыі. Адбылася сутычка, у выніку якой тры сацыял-дэмакратычных рабочых, якія дэманстравалі разам з камуністамі, ранены. Адзін штурманік забіты.

Дзяржаўныя і гарадзкія будыні Бэрліну заняты паліцыяй

ВЕНА. 3-III. «Нэйе Фрэйе Прэсэ» публікуе пісьмо свайго бэрлінскага карэспандэнта аб становішчы ў Бэрліне і настроі бэрлінскага насельніцтва.

«14 тыс. паліцэйскіх,—піша карэспандэнт,—знаходзяцца ў пастаяннай баявой гатоўнасьці. Ня толькі ўрадавыя будынкі, музэі і плацы, але газавыя заводы, электрастанцыі, водаправоды, вакзалы і вузлавыя пункты гадзіны пільнуюць зносін заняты паліцэйскімі атрадамі, якім выданы каскі і пінтоўкі. Калі б камуністы прабавалі правесьці паўстаньне, гэтым атрадам не стралялі-бы халастымі патронамі».

Усеагульная забастоўка гарнякоў у Польшчы

ВАРШАВА. 3-III. (ТАСС). Сёньня ў 6 гадз. ранцы на тэрыторыі ўсіх трох вугальных басэйнаў Польшчы—у Верхня-Сілезскім, Кракаўскім і Дамброўскім раёнах выбухнула забастоўка гарнякоў. Згодна лёзунгу рэфармісцкіх членаў забастоўка зьяўляецца дэманстрацыйнай і павінна працягвацца толькі да заўтрашняга дню. Аднак, у сувязі з базавым настроем гарнарабочых, газэты лічацца з магчымасьцю працягу стачкі.

Японскія прамыслоўцы ўзбройваюць Кітай

ТОКІЁ. 3. Агенцтва Сінбун Рэнго паведамляе з Карацу (порт на востраве Кюсю), што морская паліцыя затрымала японскі партход «Юсюзмару» які выплаў з Іокагамы з грузам у 102 ваенная аўтамабілі. Аўтамабілі выпушчаны Іокагамскім заводам «Форда» па заказу Чжан Сюэ ляна. Параход накіроўваўся ў Цзяньцзінь. Параход затрыман да атрыманьня інструкцыі з Токіё.

Пралетарыят Чэхаславакіі пратэстуе супроць фашысцкага тэрору

Адозва ЦК кампартыі Чэхаславакіі

ПРАГА. 3-III. У сувязі з падзеямі ў Германіі, ЦК кампартыі Чэхаславакіі зьвярнуўся з адозвай да ўсіх працоўных, у якой указвае, што чэхаславацкая буржуазія поўнасьцю адабрае меры Гітлера ў адносінах да кампартыі і што фашысцкая небясьпека ў самой Чэхаславакіі ўзмацнілася. Аб гэтым сьведчаць антыкамуністычныя праваканацыйныя выступленьні паліцыі. Адозва заклікае рабочых, сялян і ўсіх працоўных Чэхаславакіі бяз розьніцы партыйнай прыналежнасьці да дэманстрацыяў пратэсту супроць фашызму ў Германіі і Чэхаславакіі.

Пяхота і кавалерыя разганяюць дэманстрантаў

ПРАГА. 3-III. Па ўсёй Чэхаславакіі, ня гледзячы на забарону, праходзіла моцная хваля дэманстрацый супроць фашысцкага тэрору ў Германіі. У прамысловым цэнтры Рэйхэнбэрзе 10.000 рабочых наладзілі бурную дэманстрацыю. Дэманстрацыя была разагнаны пехотнымі і кавалерыйскімі часьцямі. Паліцыя была ўзмоцнена поўвайсковай фашысцкай арганізацыяй «Сокал». Арыштавана 90 рабочых. У Пільзэне ля ворот заводу «Шкоды», адбыўся шматлюдны мітынг. Выступаўшыя камуністычныя прамоўцы арыштаваны. У радзе іншых гарадоў таксама адбыліся дэманстрацыі, усюды праведзена шмат арыштаў. Выступленьні рабочых і беспрацоўных прынялі асабліва бадзёры характар на Закарпацкай Украіне.

У Мукачэве беспрацоўныя разграмілі хлебны магазын. У Валоўцы жандармы без папярэджаньня стралялі ў дэманстрацыю. Адзін беспрацоўны забіты.

Дэманстрацыі пратэсту перад германскім консульствам

ПРАГА. 3-III. Ня гледзячы на забарону, учора ў Брно (Маравія) перад памяшканьнем германскага консульства адбылася дэманстрацыя пратэсту 2.000 рабочых і беспрацоўных супроць фашысцкага тэрору ў Германіі. Аналёгічныя дэманстрацыі адбыліся ў Копіцах (Славакія) і Кладно (вугальна-прамысловы раён блізка Прагі). Супроць дэманстрантаў былі накіраваны жандарскія часьці.

«Ліга праў чалавека» зьвярнулася з заклікам аказваць дапамогу эмігруючым у Чэхаславакію ахвярам фашысцкага тэрору з Германіі. Аграрная «Вечар» патрабуе ад ураду закрыцьця Чэхаславацкіх граніц для камуністаў з Германіі.

Падпал рэйхстагу—повад для разгрому камуністаў

НЬЮ-ЁРК. Бэрлінскія карэспандэнты газэт адносяцца скептычна да нацыянал-сацыялісцкіх паведамленьняў, быццам рэйхстаг падпалены камуністамі. Карэспандэнт «Геральд Трыбюн» заявіў наступнае: «У Бэрліне ні адна газэта не асьмельваецца апублікаваць тое, аб чым гавораць значныя пласты насельніцтва, а іменна, што фашысты падрыхтавалі падпал для таго, каб мець повад для разгрому камуністаў».

Праваканацыйная адозва начальніка Бэрлінскай паліцыі

Начальнік Бэрлінскай паліцыі зьвярнуўся да насельніцтва з заклікам дапамагчы паліцыі, выказваючы пашыральнікаў нелегальных адозваў, «якія на працягу апошніх тыдняў затапілі імі Бэрлін», і абяцае узнагароджаньне ў разьмеры да 1000 марак кожнаму, хто на працягу сакавіка дасьць паліцыі магчымасьць арыштаваць іх. Адначасова начальнік паліцыі пагражае карай тым, хто, ведаючы пашыральнікаў або тых, хто рыхтуе гэтыя адозвы, не данясе аб іх. У заключэньне ўказваецца, што кожны хто захопіць вінаватага ў рыхтаваньні, або ў пашырэньні нелегальных антыўрадавых адозваў, мае права затрымаць яго. Аналёгічная адозва выпушчана таксама ўрадам Ольдэнбурга.

Трывожнае становішча ў Цзянцьзіне

ШАНХАЙ. 2-III. Кітайскія газэты падаюць трывожныя весткі аб становішчы ў Цзянцзінзіне.

Японская канцэсія ў горадзе акружана акопамі, дротавымі загародамі, праз якія прапускаецца электрычны ток. У склад японскага гарнізону ў Цянцьзіне, апрача ваенных часьцей у колькасьці 1.500 чал., уваходзяць 500 добраахвотнікаў. Гарнізон мае ў сваім распараджэньні 15 бранявікоў і 24 танкі. Японскія часьці ў колькасьці каля 1.000 чал. знаходзяцца на станцыі Тангу (на ўсход ад Цянцьзіня на Бэйпін-Шанхайгуаньскай чыгунцы).

У горадзе пашыраюцца ўпартыя чуткі аб надыходзячым выступленьні японцаў у Цянцьзіне Губэрнатар правінцыі Хэбэй заявіў прадстаўніком кітайскага друку, што ў выпадку японскага выступленьня ў Цянцьзіне кітайскае камандваньне можа сабраць на працягу трох гадзін 30.000 кітайскага войска для абароны гораду.

Адпраўка ваенных самалётаў на Гавайскія астравы

НЬЮ-ЁРК. 2-III. (ТАСС). «Дэйлі Уоркар» паведамляе на падставе зьвестак атрыманых ад рабочых карэспандэнтаў, што з ПАЗШ адпраўлены на Гавайскія астравы 114 ваенных самалётаў і 100 ваенных бранявікоў.

Зімовы спорт.

Аб правядзеньні міжнароднага жаночага камуністычнага дню „8-га сакавіка"

Пастанова Прэзыдыуму Менскага Гарадзкога Савету да 28-II 33 г.

Сьвяткаваньне міжнароднага жаночага камуністычнага дню «8-га сакавіка» правесьці, як сьвята інтэрнацыянальнага значэньня, пад лёзунгам міжнароднай салідарнасьці працоўных, асабковага азнаямленьня работніц і калгасьніц з умовамі працы і з капіталістычнай эксплёатацыяй работніц і сялянак заграніцай, пад знакам мабілізацыі працоўных жанчын на ажыцьцяўленьне задач 1-га году другой пяцігодкі, на выкананьне гістарычных рашэньняў студзеньскага пленуму ЦК ЦКК УсеКП(б), 3-ай сэсіі ЦВК ССР і 4-ай сэсіі ЦВК БССР.

Прэзыдыум Гарадзкога Савету пастанаўляе:

1. Склікаць 2-га сакавіка зьлёт жанчын дэпутатак Гарадзкога Савету і актыву з дакладам аб міжнародным жаночым камуністычным дні і нашых чарговых задач. На гэтым зьлёце арганізаваць рэйд дэпутатак і актыву для праверкі становішча бытавых устаноў і практычнай дапамогі ім (бытавым установам) па палепшаньню іх работы, а таксама арганізаваць брыгады і паслаць у сельсаветы для праверкі работы апошніх па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і аказаньня ў гэтым практычнай дапамогі.

2. Абавязаць сельсаветы, сэкцыі і дэпутацкія групы ў пэрыяд з 1-га сакавіка правесьці пленумы з удзелам жанчын - работніц і калгасьніц, а так сама сходы жанчын на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах з пастаноўкамі дакладаў аб міжнародным жаночым камуністычным дні і мерапрыемствах па ажыцьцяўленьню задач 1-га году другой пяцігодкі, завас трыўшы асаблівую ўвагу жанчын у вёсцы на задачах веснавой сяўбы.

3. Абавязаць дэпутацкія групы на прадпрыемствах правесьці канкрэтную работу па ажыцьцяўленьню пастаноў студзеньскага Пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), сэсій ЦВК ССР і БССР на даным прадпрыемстве, у цэху. Асабліва завастрыць пытаньне аб ролі жанчын у вытворчасьці, аб падвышэньні іх кваліфікацыі і ўздыме прадукцыйнасьці працы.

4. Абавязаць сельсаветы арганізаваць брыгады жанчын членаў сельсавету і правесьці рэйд праверкі работы саўгасаў і калгасаў па падрыхтоўчай рабоце, якая праводзіцца па арганізацыі дзіцячых ясьляў і пляцовак у сувязі з веснавой пасяўнай кампаніяй.

5. Пабудаванаму ў Менску дзіцячаму гукавому кіно надаць імя 8-е сакавіка.

6. Прапанаваць Гарздраву і Гарана адкрыць не пазьней 1-га мая ў саўгасах і калгасах 102 дзіцячыя пляцоўкі-ясьлі, 44 сады, на што вызначыць 73.400 руб. па бюджэту Гарсавету і 30.000 руб. па лекаваму фонду.

Прыцягнуць таксама да гэтай справы сродкі грамадзкіх арганізацый: «Чырвонага Крыжу» — 15.000 руб., «Прыхільніка дзяцей»—20.000 руб.

7. Прапанаваць сельсаветам і калгасам (пад адказнасьць старшынь) і саўгасам (пад адказнасьць дырэктароў) зараз-жа разгарнуць падрыхтоўчую работу па адчыненьню дзіцячых пляцовак, ясьляў і садоў, забясьпечыць іх адведнымі памяшканьнямі і абсталяваньнем, вызначыць фонды прадуктаў для харчаваньня дзяцей. Для арганізацыі і ажыцьцяўленьня ўсіх гэтых мерапрыемстваў у кожным саўгасе і калгасе выдзяліць адказных за гэту справу асоб.

8. Даручыць Гарснабу і Райспажыўсаюзу выдзяліць адпаведныя фонды вопраткі, абутку, пасуды і прадуктаў харчаваньня (цукар, мыла і г. д.) для забясьпячэньня садоў, ясьляў і пляцовак.

9) Гарана арганізаваць забясьпячэньне садоў, ясьляў і пляцовак цацкамі.

10) Даручыць Гарана правесьці кароткатэрміновыя курсы работнікаў, якія працавалі ў мінулым годзе ў дзіцячых садох, ясьлях і пляцоўках, для скарыстаньня іх на гэтай рабоце ў гэтым годзе.

11) Абавязаць Гарздраў забясьпечыць дзіцячыя сады, ясьлі і пляцоўкі мэдыцынскім абслугоўваньнем, прымацаваўшы для гэтага патрэбную колькасьць мэд. работнікаў.

Старшыня Менгарсавету.
ВАЛОДЗЬКА

Сакратар Менгарсавету
ЯГОЎДЗІК

Абавязковая пастанова

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

17 лютага 1933 г. № 1 гор. Менск

Аб вулічным руху ў гор. Менску[1])

Разьдзел III

Гужавы (конны) транспарт

63. Да кіраваньня коннымі экіпажамі допускаюцца асобы, якія маюць права на язду і не маладзей 18 год.

64. Забараняецца:

а) язда на конях і іншай запрэжнай жывёле, нявыежджаных, хворых, няўзнузданых, пакованых і нячышчаных;

б) язда па лініях трамваю, за выключэньнем выпадкаў, калі інакш няма магчымасьці праехаць;

в) пераезд цераз трамвайную лінію пры набліжэньні вагона трамваю, калі апошні знаходзіцца на адлегласьці, якая не дазваляе пераехаць лінію своечасова;

г) язда на санях без падрэзаў, якія перашкаджаюць раскату;

д) астаўленьне коняй і іншай запрэжнай жывёлы без нагляду;

е) прывязваньне коняй да дрэў, лік тароў, рашотак і т. д.;

ж) стаянка ня ў месцы, устаноўленых органамі РС Міліцыі;

з) кармёжка на вуліцах запрэжнай жывёлы бяз торбаў ці мяхоў.

Грузавыя конныя экіпажы

65. Грузавыя конныя экіпажы павінны мець нумарны знак, прымацаваны з левага боку дугі, на відным месцы, які павінен быць заўсёды ў спраўнасьці і незабруджаным.

Замаўчаньне нумарных знакаў аркамі і павадамі не дапускаецца.

66. Ламавыя возчыкі абавязаны:

а) мець афарбаваную дугу, на якой з ліцавога боку павінна быць напісана назва ўстановы ці прозьвішча ўласьніка.

Пры запрэжцы бяз дугі указаныя надпісы павінны быць зроблены на асобнай мэталёвай дошцы, якая прымацоўваецца з левага боку знадворна на борту павозкі;

б) мець бляшку (нумарны знак), прыбітую да дугі з левага боку ззаду, а пры запрэжцы бяз дугі—на экіпажы з левага боку;

в) пры язьдзе трымацца бліжэй да тратуару ў адзін рад, астаўляючы вольна ад сябе праезд для абгону;

г) ехаць шагам як з грузам, так і паражняком.

67. Прывязваньне запрэжнай жывёлы ззаду да папярэдніх падвод забараняецца.

Возчык павінен ісьці з правага боку. Ісьці па тратуару возчыку забараняецца.

68. Пры кожнай грузавой конной павозцы павінен быць возчык, які абавязан трымаць вожкі ў руках ці весьці жывёлу пад вузду;

69. Язда на вуліцах адбываецца выключна шагам, і ў адзін рад. Пры сьледваньні абозам паміж падводамі павінен быць інтэрвал у 1 мтр., праз кожныя 3 падводы павінен быць інтэрвал для свабоднага праходу; таксама інтэрвалы павінны быць і пры астаноўцы абозу.

70. Нагрузка кожнай падводы павінна адпавядаць сіле жывёлы і станоўчу шляху. У выпадку, калі жывёла чаму-небудзь ажакацца ніздольнаю везьці груз, возчык абавязан прыняць меры да аблягчэньня падводы.

71. Забараняецца ўжываньне для падгону жывёлы мучыцельных спосабаў і прадметаў, якія калечаць жывёлу і наогул забараняецца жорсткае абыходжаньне з ёю.

72: Перавозка грамодзкіх матар'ялаў, напрыклад: рэйк, балак, бярвён і дошак павінна рабіцца на роспусках альбо на санях з падсанкамі. Груз павінен быць уложан і ўвязан так, каб не выдаваўся па бакох, не цягнуўся па маставой, не ствараў пры перавозцы шуму і грохату і не перавышаў 3-х мэтраў у вышыню, лічачы ад маставой.

73. Пры спуску з гары і ў іншых неабходных выпадках, павозкі павінны тармазіцца: Язда без шлем на канях забараняецца.

74. Забараняецца з 10 гадзін і да 21 гадзіны транзітны праезд грузавым конным экіпажам па вуліцах:

1) Савецкай ад Валадарскага да Чырвонаармейскай;

2) Ленінскай ад пляцу Волі да Савецкай;

3) Энгельса ад пляцу Волі да Савецкай;

4) Карла Маркса;

5) Нова-Бабруйская.

75. Для стаянкі грузавых конных экіпажаў устанаўляюцца наступныя месцы:

1) на рагу Нямігскай і Нямігa-Ракаўскай;

2) на рагу Камунальнай і Семінарскага завулку;

3) на рагу вуліц Талстога і Маскоўскай;

4) каля Койданаўскага тракту;

5) на пляцу, каля 3-й Савецкай лазьні.

76. Устанаўляюцца наступныя маршруты для грузавога транспарту:

А. ГРУЗАВЫ РУХ З ТАВАРНАЙ МББ—ЭЛЬВОД. ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК

Койданаўскі тракт, Маскоўская, Мясьнікова, Няміга, Калініноўскага, Гандлёвая, Кастрычніцкая, Садовая і на Савецкую.

Б. РАЁН БАЛОТНАЙ СТАНЦЫІ:

З Гандлёвай на Шырокую, МОПР'аўскую, Камунальную на Смаргоўскі Тракт. На Пярэспу: Камунальная Старажоўка, Далінаўскі тракт.

В. З ТАВАРНАЙ У РАЁН ЛЯХАЎКІ

Маскоўская. Бабруйская, Ленінградская, Земляробская, Сьвярдлоўская, Крутагорскі завулак, 2-гі Ляхаўскі мост і вул. Варашылава.

Г. РАЁН ЛЯХАЎКА—КАМАРОЎКА

Чырвонаармейская да Першамайскай, Першамайская, Фрунзэўская і Савецкая.

Д. ЛЯХАЎКА—ПЯРЭСПА

Чырвонаармейская, Першамайская, Пралетарска-Набережная, Пралетарская, Шырокая, Старажоўская, Пярэспа.

Е. ПАСАЖЫРСКІ ВАКЗАЛ.

У раён Ляхаўкі: Ульянаўская, Сьвярдлоўская, Унівэрсытэцкая, Чырвонаармейская, Першамайская.

Легкавыя конныя экіпажы

77. Збруя і экіпаж павінны заўсёды быць у спраўнасьці.

78. Экіпаж павінен быць забясьпечан фартухом, а сані полацьцю. Легкавыя экіпажы павінны мець два нумарных знакі, прымацаваны: адзін зьлева на сядзеньні, другі зьлева ззаду на кузаве. Нумарныя знакі пазьнічы быць у спраўнасьці і ў незабруджаным выглядзе.

79. Легкавыя фурманы абязаны мець чыстую адзежу.

80. Вадзіцелям легкавых конных экіпажаў у часе руху забараняецца сядзець на месцах сядакоў.

81. Для легкавых возчыкаў устанаўляюцца месцы стаянак:

1) на рагу Камсамольскай і Рэвалюцыйнай;

2) на рагу Рэвалюцыйнай і Рэспубліканскай;

3) на рагу Савецкай і Вайсковай;

4) на рагу Камунальнай і Камунальнага завулку;

5) на рагу Камунальнай і Старажоўскай;

6) на рагу Сьвярдлоўскай і Ленінградскай;

7) на рагу Рэспубліканскай і 25 Кастрычніка;

8) на рагу Савецкай і Сьвярдлоўскай;

9) на рагу Ленінскай і Унівэрсытэцкай;

10) каля станцыі Менск-Таварная;

11. каля станцыі Менск-Пасажырская;

12. Кастрычніцкая, каля скверу.

82. Забараняецца прымаць седакоў у колькасьці больш 3-х асоб, а таксама вазіць груз, які выходзіць за межы шырыні экіпажу.

Асэнізацыйны абоз

83. Да язды па гораду допускаюцца толькі бочкі, калымагі і пасуда, прызначаныя для ўдаленьня нячыстот альбо сьмецьця, агледжаныя спэцыяльнай камісіяй і забясьпечаныя нумарам, трымацаваным да заднягa дышла бочкі, калымаг і т. д. Выезд на работу з нясправнай, цякучай і забруджанай бочкаю і калымагамі забараняецца.

84. Пры сьледваньні з нячыстотамі ці сьмецьцем абозы павінны ехаць шагам і не астанаўліваца.

Выключныя перавозкі

85. Перавозка грузаў вялікай вагі альбо непадзельных грузаў, якія перавышаюць максымальныя нормы па вазе і па разьмерах, ці патрабуюць запрэжкі больш 3 коняй, а таксама ва ўсіх выпадках, калі транспартыроўка можа парушыць парадак і бясьпечнасьць вулічнага руху,—зьяўляюцца выключнымі перавозкамі і патрабуюць асобнага дазволу Кіраўніцтва РС Міліцыі.

Перавозка пылаўтваральных матар'ялаў

86. Сьмецьце, будаўнічы сыпучы матар'ял і іншыя пылаўтваральныя матэрыі, якія перавозяцца бяз тары, павінны закрывацца брэзэнтам, рагожамі ці іншым паўнамерным пакрывалам.

Перавозка небясьпечных матэрый

87. Перавозка мінэральных кіслот, уапалымных едкіх вадкасьцяй і іншых шкодных матэрый, павінна рабіцца пры захаваньні наступных умоў:

а) экіпажы павінны быць на рэсорах;

б) пасуда павінна быць добра ўпакавана, не цячы і не ссоўвацца пры штуршках;

в) калі ў часе руху вадкасьць ці шкодная матэрыя астаўляе па дарозе сьлед, вадзіцель павінен неадкладна астанавіцца, папярэдзіць акружаючых аб небясьпецы і пасьпяць заражанае месца пяском ці іншым сыпучым матар'ялам. Адначасова ён абавязан даць знаць аб здарэньні на бліжэйшы міліцэйскі пост і да дазволу аполіцыя ня мае права працягваць рух.

Пры перавозцы легка-ўзгаральных і ўзрыўчатых матэрый, апрача ўказанага вышэй парадку, належыць кіравацца спэцыяльнымі правіламі.

Укладка грузу

88. Груз павінен быць разьмяркован і замацоваў на транспарце такім чынам, каб ён пры руху ня мог ссунуцца, зваліцца, засьмеціць вуліцы і ствараць шум.

89. Забараняецца цягнуць груз па зямлі.

Разьдзел IV

Правілы язды на вэлёсыпэдах

90. Да язды на вэлёсыпэдах па гораду дапускаюцца асобы, якія умеюць на іх езьдзіць і не маладзей 15 год. і якія атрымалі нумарны знак.

Нумарны знак прымацоўваецца на задняй вілцы, не ацёбючы вілкі.

91. На кожным вэлёсыпэдзе павінна быць тармазная прылада, званок ці ражковы сыгнал, а па наступленьні цемнаты—запалены ліхтар.

92. Забараняецца:

а) язда па тратуарах і пешаходных дарожках паркаў і бульвараў;

б) язда з хуткасьцю звыш 12 клм. у гадзіну, язда ў перагонку, практыкаваньне і навучаньне на вуліцах, плошчах і іншых праездах;

в) язда не трымаючыся за руль;

г) язда чапляючыся да вагонаў трамваю, аўтамабіляў і экіпажаў;

д) язда на адмесных вэлёсыпэдах удваіх, а таксама з дзецьмі;

е) язда паміж трамвайнымі путямі.

93. Пры групавой язьдзе вэлёсыпэдысты павінны ехаць адзін за другім, на адлегласьці ня менш 2 мэтраў адзін ад другога.

94. У месцах вялікага натоўпу публікі і экіпажаў вэлёсыпэдыст павінен сайці з вэлёсыпэду і весьці яго ў руках.

Разьдзел V

Рэйкавы транспарт (трамвай)

95. Да кіраваньня вагонамі трамваю допускаюцца асобы не маладзей 20 год. якія маюць права на кіраваньне і якія павінны быць зарэгістраваны ў органах РС Міліцыі і мець адпаведнае пасьведчаньне.

96. Вагонаважатаму забараняецца ў часе руху:

а) размаўляць,

б) прымаць яду;

в) забіваць руку з вялікай рукаяткі кантралёра і навотранага тормазу.

Пры спусках і на перакрыжаваньнях вагонаважаты павінен працаваць абавязкова стоячы.

97. Не дапускаюцца да руху вагоны трамваю:

а) з нясправнымі тармазамі, пясочніцамі і ахоўнымі сеткамі;

б) з нясправнымі рэбартамі і дугамі;

в) з нясправнасьцямі ў кантралёры і ў адным з матораў;

г) пры адсутнасьці тускных сыгналаў.

98. Вагонаважаты абавязан даваць загадзя ўстаноўленыя сыгналы:

а) перад пачаткам руху;

б) пры пераслічэньні вуліц,

в) на паваротах;

г) у месцах вялікага натоўпу публікі;

д) грамадзянам і транспарту, якія перасякаюць лінію трамваю.

99. Вагонаважаты абавязан, прыцішыць ход вагона, ці астанавіць яго:

а) пры пераходзе вайсковых часьцей строем, дэманстрантаў, партый арыштаваных і пагонаў усякіх арганізаваных працэсій;

б) пры паваротах, заакругленьнях, на стрэлках і пасячэньнях ліній;

в) пры спуску з гары.

100. Пры пасадцы публікі ў вагоны трамваю кандуктар абавязан даваць сыгнал да руху толькі пасьля таго, як спыніцца ўваход і выхад пасажыраў—пры ўмове, калі на падножках няма пасажыраў.

101 Вагонаважаты павінен астанавіць вагон на патрабаваньню кандуктара, кантралёра, службовых асоб РС Міліцыі прычым астаноўлены вагон не павінен загароджваць праход ці праезд другому транспарту

102. З наступленьнем цемнаты і пры густым тумане пярэдняя ліхтары трамвайных вагонаў павінны быць запалены.

103. На астаноўках і пры вынужаных прастоях вагонаважаты абавязан астанаўліваць вагон так, каб не перашкаджаць папярэчнаму руху пешаходаў і транспарту.

104. Забараняецца грамадзянам пры чапляцца да вагонаў трамваю, весьці на падножках уваходзіць і выходзіць з іх у часе руху вагонаў, выходзіць праз заднюю пляцоўку.

105. На пярэдняй пляцоўцы motora нага вагона трамваю дазваляецца праезд 2 працаўнікам РС Міліцыі.

Разьдзел VI

Пешаходны рух

106. Пешаходны рух адбываецца толькі па тратуарах (панэлях), перакрыжаваньнях, бульварах і спэцыяльных пераходах, адзначаных асобнымі знакамі (паказьнікамі).

107. Пешаходы абавязаны:

а) пры руху на тратуарах трымацца правага боку ў напрамку руху;

б) не астанаўліваца там, дзе гэта перашкаджае руху;

в) ня зьбірацца ў групы, якія перашкаджаюць руху;

г) пераходзіць на другі бок толькі на перакрыжаваньнях па простай лініі а не наўскасяк па наступных вуліцах: Савецкай, Маскоўскай, Ленінскай, К. Маркса, Энгельса і Камунальнай і ў месцах, адзначаных асобнымі паказьнікамі, зьвяртаючы ўвагу на папярэджвальныя знакі;

д) не ходзіць па маставой удоўж вуліцы;

е) пры перавозцы грамодзкіх матар'ялаў, дошак, за замену тратуарам.

Разьдзел VII

Вулічны гандаль

109. Вулічны гандаль з латкоў, кіёскаў, а таксама ў разнос і развоз ад бываецца ў адведзеных для гэтага месцах.

110. Адвод месц пад гандаль робіцца Гаркамгасамі па ўзгодненьні ў кожным паасобным выпадку з Кіраўніцтвамі РС Міліцыі.

111. Забараняецца ўсякая самавольная перастаноўка пабудоў і павялічэньне разьмеру займаемай плошчы

112. Забараняецца гандлюючым у разнос і ў развоз раскладваць свае тавары на маставых, тратуарах, пад'ездах, выступах дамоў і т. д.

Разьдзел VIII

Наладжваньне земляных і іншых работ і пабудоў на вуліцах і пераездах

113. Разрыцьцё маставых робіцца з дазволу Гаркамгасу.

114. Пабудова навесаў і казыркоў над вокнамі жылых і гандлёвых памяшканьняў, а таксама ўстаноўка рэклямных вывесак, якія выходзяць на тратуары, дапускаецца ня ніжэй 2-х мэтраў ад узроўню тратуару. Казыркі і вывескі павінны быць добра прымацаваны і не выступаць за край тратуару на вуліцу.

115. Усе рэклямныя ўстаноўкі і вывескі вывешваюцца на ўзгодненьні з Кіраўніцтвамі РС Міліцыі.

116. Забараняецца на тратуарах і маставых:

а) складваньне грузу і тары пры нагрузцы ці разгрузцы грузавых экіпажаў;

б) піла і колка дроў і іншых падобных дзейнасьцяў, якія разбураюць тратуар і абмяжоўваюць вулічны рух.

Нам. Начальніка Гаўдзнага Кіраўніцтва РС Міліцыі пры СНК БССР
ПЭДЭР.

[1]) Прадгл. Пачатак гл. «Сав. Бел.» № 50 за 4 сакавіка 1933 г.

Уп. Галоўлітбелу № А—210.

Адказны рэдактар—П. ШАСТАКОЎ.

Друкарня імя СТАЛІНА.